Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

2 ЛІСТАПАДА 2023 г. ЧАЦВЕР № 213 (30093)

НОВЫЯ ПЕРСПЕКТЫЎНЫЯ АБ'ЕКТЫ ГОМЕЛЬШЧЫНЫ 3

ПРЫМУСІЦЬ БЫЦЬ БАЦЬКАМ НЕМАГЧЫМА

## ЦЫТАТА ДНЯ

**Валянцін СУКАЛА, старшыня Вярхоўнага Суда:**

*«Сёння сістэма судоў агульнай юрысдыкцыі функцыянуе стабільна, забяспечвае належны ўзровень законнасці судовых пастаноў, адкрытасці і даступнасці правасуддзя. Дасягнуты больш высокі ўзровень арганізацыі, аператыўнасці і якасці правасуддзя, што пацвярджае правільнасць абранай мадэлі нацыянальнага правасуддзя. Пазітыўным, на мой погляд, з'яўляецца тое, што абраны намі паэтапны і паслядоўны характар судовых пераўтварэнняў не прывёў да якіх-небудзь ускладненняў у стане грамадскага правапарадку, законнасці і крымінагеннай сітуацыі».*

# Станкі на канвееры

Фота БелТА.

Слесар-электрамантажнік Арцём ФРАНКОЎ і слесар механазборачных работ Андрэй КОНАНАЎ *(на фота)* працуюць на Аршанскім заводзе «Чырвоны барацьбіт». Тэмп росту вытворчасці на прадпрыемстве, якое выпускае розныя станкі, за дзевяць месяцаў склаў 123,3 працэнта. Высокі тэхналагічны ўзровень вытворчасці на адным з найбуйнейшых прадпрыемстваў станкабудаўнічай галіны дае магчымасць выпускаць абсталяванне сучаснага ўзроўню.

**Паводле БелТА.**

## КАРАТКА

**• Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 1 лістапада правёў тэлефонную размову з Прэзідэнтам Расіі Уладзімірам Пуціным. Галоўнай тэмай размовы стаў маючы адбыцца ў лістападзе саміт кіраўнікоў дзяржаў АДКБ. Лідары краін абмеркавалі і тэматыку двухбаковага супрацоўніцтва з акцэнтам на асноўных напрамках, у тым ліку энергетыку і праекты ў галіне імпартазамяшчэння.**

• У Беларусі ўтвораны выбарчыя акругі па выбарах дэпутатаў мясцовых Саветаў.

**• Падпісаны акт прыёмкі ў прамысловую эксплуатацыю другога энергаблока БелАЭС.**

Дзяржаўны інтарэс

## Калідор да мора і падлік пасажыраў

### Дарожнікі і транспартнікі расказалі пра ўдасканальванне айчынных шляхоў

**Стан дарог у Беларусі, іх рамонт і будаўніцтва — заўжды пад пільнай увагай кіраўніка дзяржавы. Сёлета ў краіне павінна быць адрамантавана і збудавана каля трох тысяч кіламетраў дарог. Налета, як чакаецца, новы выгляд атрымаюць яшчэ больш як чатыры тысячы кіламетраў, на будаўніцтва і рэканструкцыю якіх выдзеляць 2,2 мільярда рублёў. Па плане, у 2024-м будуць рэалізаваны два пілотныя праекты па развіцці электратранспарту: у Жодзіне (Мінская вобласць) і Шклове і раёне (Магілёўская вобласць) — пра гэта, дарэчы, гаварылі на нядаўняй нарадзе ў Прэзідэнта па БелАЭС. А пра планы на наступны год і папярэднія вынікі сёлетняга расказалі самі дарожнікі і транспартнікі.**

СТАР. 4

Спецыяльны рэпартаж

## Моцныя духам

### Пацыенты Цэнтра дапамогі ахвярам ДТЗ пра жыццё насуперак абставінам

**Прачнуцца раніцай, памыцца, паснедаць і прыняць таблеткі, а затым займацца некалькі гадзін на хатніх трэнажорах, распрацоўваючы непаслухмяныя рукі ці ногі, — праз невыносны боль, ад якога з вачэй коцяцца слёзы, не шкадуючы сябе. З іншых даступных заняткаў — выезд у двор на інвалідным вазку, фільм, кніга ці гульня на камп'ютары. А заўтра ўсё паўтарыць зноў... Штогод у Беларусі адбываецца больш за тры тысячы ДТЗ, у якіх гіне каля 450 чалавек, а больш за тры тысячы атрымліваюць траўмы. На жаль, многім з іх ніколі не ўдасца аднавіцца цалкам. Такіх людзей не ўбачыш на вуліцы ці ў краме, яны прыкаваны да ложка ці інваліднага вазка.**

СТАР. 13

ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

У НОВЫ ГОД – СА СТАРЫМ СЯБРАМ!

Ідзе падпіска на I паўгоддзе 2024 года.

Усім, хто падпісаўся на I квартал або I паўгоддзе 2024 года, у падарунак чатыры календары: насценны, рэлігійны, народны і месяцавы.

Парламенцкі дзённік

# ДАБРАБЫТ І БЯСПЕКА ГРАМАДЗЯН

## Дэпутаты разгледзелі пакет бюджэтна-падатковых дакументаў на будучы год, а таксама зацвердзілі шэраг своечасовых змяненняў

**Традыцыйна захоўваецца сацыяльная накіраванасць бюджэтных расходаў. Будзе працягвацца дзяржаўная падтрымка людзей пажылога ўзросту, сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей, — аб гэтым сведчыць павелічэнне пенсій і шматлікіх відаў дапамог. Не застануцца без увагі і тыя, хто выхоўвае дзяцей-інвалідаў.**

### ПЕНСІІ Ў СЯРЭДНІМ ПАВЯЛІЧАЦЦА НА 15 %

Адразу ў двух чытаннях адобраны праект Закона «Аб бюджэце дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Рэспублікі Беларусь на 2024 год». Законапраектам вызначаюцца крыніцы фарміравання даходаў бюджэту фонду, іх аб'ём, а таксама кірункі выкарыстання сродкаў, устанаўліваецца парадак выканання бюджэту фонду.

Даходы бюджэту фонду разлічаны ў суме 28 225,8 млн рублёў. Асноўную долю ў структуры ўзносаў на дзяржаўнае сацыяльнае страхаванне складаюць абавязковыя страхавыя ўзносы работадаўцаў і працоўных грамадзян — 25 559,6 млн рублёў. Узносы на прафесійнае пенсіённае страхаванне разлічаны ў суме 253 млн рублёў. Непадатковыя даходы бюджэту фонду складаюць 500,6 млн рублёў. Субвенцыі з рэспубліканскага бюджэту прадугледжаны ў памеры 1 742,3 млн рублёў.

Расходы бюджэту фонду разлічаны ў суме 27 768,7 млн рублёў. Пры гэтым асноўную суму расходаў — 22 037,1 млн рублёў — прадугледжана накіраваць на фінансаванне пенсіённага забеспячэння. Агульная сума расходаў бюджэту фонду, якія накіроўваюцца на фінансаванне дапамог, складзе 5 534,4 млн рублёў. Акрамя таго, запланавана фінансаванне па іншых артыкулах расходаў у адпаведнасці з мэтавым прызначэннем сродкаў фонду.

— У 2024 годзе ў сярэднім пенсіі па ўзросце павялічацца на 15 %, — паведаміла **міністр працы і сацыяльнай абароны Ірына КАСЦЕВІЧ**. — На фінансаванне ўсіх відаў дапамог чакаецца накіраваць каля 19 % ад усіх расходаў. На выплату дапамог сем'ям у сувязі з нараджэннем і выхаваннем дзяцей запланавана накіраваць 3 млрд рублёў. Па доглядзе за дзіцем ва ўзросце да трох гадоў — 1,8 млрд рублёў. Таксама выплачваюцца дадатковыя дапамогі сем'ям, дзе выхоўваецца дзіця ва ўзросце да трох гадоў, на дзяцей ва ўзросце ад трох да 18 гадоў. Такія расходы ў 2024 годзе складуць 275 млн рублёў. Больш як 160 млн рублёў плануецца накіраваць на дапамогі па доглядзе дзіця-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў, а таксама 172 млн рублёў — на дзяцей, старэйшых за тры гады, у сем'ях, дзе выхоўваецца дзіця-інвалід.

У цэлым, бюджэт фонду на 2024 год сфарміраваны з прывышэннем даходаў над расходамі за кошт сродкаў прафесійнага пенсіённага страхавання ў суме 457,1 млн рублёў.

### У ПРЫЯРЫТЭЦЕ — АДУКАЦЫЯ І АХОВА ЗДАРОЎЯ

Яшчэ адзін важны фінансавы дакумент на будучы год разгледзелі парламентарыі. У першым чытанні прыняты законапраект «Аб рэспубліканскім бюджэце на 2024 год».

Праект рэспубліканскага бюджэту і разліковыя паказчыкі па бюджэтах абласцей і сталіцы на 2024 год распрацаваны на аснове палажэнняў праграмных дакументаў па сацыльна-эканамічным развіцці краіны з улікам эканамічнай сітуацыі, якая складваецца. Ключавымі задачамі Беларусі ў будучым годзе будуць захаванне ўстойлівасці бюджэтнай сістэмы, безумоўнае выкананне ўсіх пазыковых абавязацельстваў, выкарыстанне сродкаў бюджэту ў адпаведнасці з прыярытэтамі сацыяльна-эканамічнага развіцця і павышэнне на гэтай аснове дабрабыту беларускага народа.

Такім чынам, даходы рэспубліканскага бюджэту на 2024 год прадугледжваюцца ў суме 39 906,4 млн рублёў. Асноўнымі крыніцамі падатковых даходаў рэспубліканскага бюджэту з'яўляюцца падатак на дабаўленую вартасць, акцызы, падатковыя даходы ад знешнеэканамічнай дзейнасці. Расходы рэспубліканскага бюджэту на будучы год сфарміраваны ў суме 44 657,4 млн рублёў.

Захаваецца сацыяльная накіраванасць бюджэтных расходаў. У прыярытэце — фінансаванне сфер адукацыі і аховы здароўя, а таксама рэалізацыя мер, накіраваных на павышэнне якасці жыцця насельніцтва, падтрымку шматдзетных сем'яў. Прадугледжана фарміраванне сямейнага капіталу ў суме 382,5 млн рублёў. Значную частку ў бюджэце складуць расходы на аплату працы, пенсіі, стыпендыі, дапамогі, іншыя выплаты, сродкі на выкананне дзяржаўных сацыяльных стандартаў. Фарміраванне праекта рэспубліканскага бюджэту на будучы год выканана з дэфіцытам у памеры 4 751,1 млн рублёў.

### ДЛЯ ЎЛАДАЛЬНІКАЎ ЛЮКСАВЫХ АЎТО — ПАВЫШАНЫ ПАДАТАК

Змяненні закрануць і Падатковы кодэкс. Законапраект «Аб змяненні Падатковага кодэкса Рэспублікі Беларусь» прадугледжвае сістэмныя меры па ўдасканаленні падатковага заканадаўства і дасягненні аптымальнага ўзроўню падатковай нагрузкі на эканоміку, не дапускаючы зніжэння аб'ёму бюджэтных даходаў.

У прыватнасці, адбудзецца індэксацыя ставак падаткаў з улікам інфляцыйных працэсаў. Чакаецца трансфармацыя або адмена асобных малаэфектыўных падатковых ільгот. Адмяняецца ўплата падатку на дабаўленую вартасць для індывідуальных прадпрымальнікаў па абаротах па рэалізацыі тавараў (работ, паслуг). Павялічваецца стаўка падатку на прыбытак для высокарэнтабельных арганізацый і прадпрыемстваў усіх форм уласнасці — з 20 % да 25 % пры атрыманні прыбытку звыш 25 млн рублёў у год. Устанаўліваецца стаўка падаходнага падатку ў памеры 25 % у адносінах частак даходаў, якія атрымліваюцца фізічнымі асобамі звыш 200 тыс. рублёў за каляндарны год.

Як адзначыла **член Пастаяннай камісіі па бюджэце і фінансах Палаты прадстаўнікоў Святлана БАРТАШ**, прадугледжана льгота для выпускнікоў вышэйшых, сярэдніх і прафесійна-тэхнічных навучальных устаноў па падатковым выліку ў памеры 620 рублёў па падаходным падатку на сем гадоў. «Гэта падтрымка нашых маладых спецыялістаў, якія пойдуць працаваць у рэальны сектар эканомікі», — патлумачыла сутнасць новаўвядзення дэпутат.

Яшчэ адна навацыя — у дзесяць разоў павялічваецца стаўка транспартнага падатку для ўладальнікаў транспартных сродкаў павышанай камфортнасці, з году выпуску якіх прайшло не больш як тры гады. Уводзіцца паняцце «адзіны маёмасны плацеж», які ўяўляе сабой агульную суму падатку на нерухомасць, зямельнага і транспартнага падаткаў. Плануецца, што ён будзе ўплачвацца фізічнай асобай на адзін рахунак рэспубліканскага бюджэту. Акрамя таго, устанаўліваецца забарона на ажыццяўленне дзейнасці ў статусе індывідуальнага прадпрымальніка, калі яго даход на працягу года перавысіць 500 тысяч рублёў. У такім выпадку з наступнага каляндарнага года грамадзянін мае права працягнуць ажыццяўленне дзейнасці толькі ў статусе камерцыйнай арганізацыі.

«Усе гэтыя кірункі прыцягнуць у бюджэт у межах 750 млн рублёў, што дазволіць сфарміраваць рэспубліканскі бюджэт, мясцовыя бюджэты і забяспечыць стабільную работу эканомікі ў 2024 годзе», — рэзюмавала Святлана Барташ.

### З КЛОПАТАМ АБ ТЫХ, ХТО Ў ІМ МАЕ ПАТРЭБУ

З мэтай забеспячэння даступнасці і якасці сацыяльных паслуг, стварэння ўмоў для максімальна працяглага пражывання непрацаздольных грамадзян у звыклым для іх асяроддзі ўнесены змяненні ў законы па пытаннях сацыяльнага абслугоўвання і сацыяльных выплат.

У прыватнасці, выключаюцца нормы, накіраваныя на змяненне падыходаў да выплаты дапамогі па доглядзе інвалідаў першай групы або састарэлых (звыш 80 гадоў). Дапрацаваны палажэнні, якія датычацца арганізацыі выплаты пенсій і дапамог грамадзянам пераважна праз банкі. Права атрымліваць па жаданні пенсію праз банк або пошту захоўваецца для асоб ва ўзросце звыш 70 гадоў, інвалідаў I і II груп, а таксама для пенсіянераў, якія жывуць у сельскай мясцовасці. Выплату дапамог на дзяцей прапаноўваецца ажыццяўляць праз банкі ўсім атрымальнікам, за выключэннем асоб з I і II груп інваліднасці, тых, каму дапамогі прызначаны ў сувязі з выхаваннем дзіцяці-інваліда, а таксама сельскіх жыхароў.

Уключаюцца нормы, якія ўстанаўліваюць, што дзейнасць камерцыйных арганізацый, якія аказваюць сацыяльныя паслугі ў форме стацыянарнага сацыяльнага абслугоўвання, будзе ажыццяўляцца на аснове ліцэнзіі. Прадугледжана перадача функцый па дастаўцы пенсій і іншых сацыяльных выплат ад унітарных прадпрыемстваў па дастаўцы пенсій і дапамог нацыянальнаму аператару паштовай сувязі РУП «Белпошта».

### ПАТРАБАВАННІ ДА ЎЗНАГАРОДЖАНЫХ ОРДЭНАМ МАЦІ І НОВАЕ ЗВАННЕ

У першым чытанні парламентарыі прагаласавалі за законапраект «Аб змяненні Закона Рэспублікі Беларусь «Аб дзяржаўных узнагародах Рэспублікі Беларусь». Законапраектам рэалізоўваюцца прадугледжаныя паўнамоцтвы Усебеларскага народнага сходу ў частцы ўзнагароджання Прэзідэнта Беларусі дзяржаўнымі ўзнагародамі. А таксама ўнясення прапаноў для ўзнагароджання дзяржаўнымі ўзнагародамі іншых асоб.

Удасканальваецца парадак узнагароджання ордэнам Маці. Актуалізуюцца патрабаванні да кандыдатур, якіх прадстаўляюць да гэтай высокай узнагароды. «Улічваючы асноўную ідэалагічную задачу ордэна Маці (гэта павышэнне прэстыжу мацярынства і шматдзетнасці, умацаванне духоўна-маральных сямейных каштоўнасцяў), прапаноўваецца прадстаўляць да ўзнагароджання ордэнам Маці жанчын, якія валодаюць высокімі маральнымі якасцямі і адказнасцю ў выхаванні і ўтрымліванні дзяцей, клопаце аб іх здароўі, развіцці, навучанні, падрыхтоўцы да грамадска карыснай працы, прывіцці ім культуры павагі да законаў і гістарычных, нацыянальных традыцый беларусаў», — адзначыў **намеснік міністра юстыцыі Алег КОТ.**

Жанчыны-кандыдаты на ордэн Маці павінны мець грамадзянства Рэспублікі Беларусь, выхоўваць пяць і больш дзяцей, якія таксама з'яўляюцца грамадзянамі нашай краіны.

З мэтай павышэння аўтарытэту і прэстыжу дзейнасці айчынных журналістаў плануецца ўнесці ў сістэму дзяржаўных узнагарод ганаровае званне — «Заслужаны работнік сродкаў масавай інфармацыі Рэспублікі Беларусь». Гэтае званне можа быць прысвоена высокакваліфікаванаму спецыялісту, які працуе ў сферы масавай інфармацыі на працягу 15 і больш гадоў.

### ІНФАРМАВАННЕ АБ ПРЫЗЫВЕ — З ДАПАМОГАЙ СМС-ПАВЕДАМЛЕННЯ

Шэраг новаўвядзенняў закране заканадаўства па пытаннях забеспячэння нацыянальнай бяспекі. У прыватнасці, павялічваюцца санкцыі за здзяйсненне злачынстваў і адміністрацыйных правапарушэнняў, звязаных з ажыццяўленнем мерапрыемстваў па прызыве на воінскую службу. Удакладняюцца гарантыі і кампенсацыі для супрацоўнікаў у сувязі з іх прызывам на воінскую службу або прыёмам на ваенную службу. Службовыя асобы органаў дзяржаўнай бяспекі надзяляюцца паўнамоцтвамі на складанне пратаколаў аб адміністрацыйных правапарушэннях за нез'яўленне без уважлівых прычын на мерапрыемствы па прызыве на воінскую службу.

Кіраўнік дзяржавы надзяляецца паўнамоцтвам на прыняцце рашэння аб прыёме на ваенную службу па кантракце грамадзян, з якімі кантракт аб праходжанні ваеннай службы не можа быць заключаны з-за пэўных абмежаванняў. Акрамя таго, прадугледжана права прымаць на добраахвотнай аснове ўдзел у выкананні работ абарончага характару ў мірны час. Устанаўліваецца прававая абарона медыцынскіх работнікаў з мэтай выключэння магчымых для іх негатыўных наступстваў пасля звальнення ваеннаслужачых тэрміновай ваеннай службы з Узброеных Сіл па стане здароўя. Ваенныя камісары надзяляюцца правам абмяжоўваць выезд за межы краіны грамадзян, якія парушаюць абавязкі па воінскім уліку і ўхіляюцца ад мерапрыемстваў прызыву на воінскую службу.

Як расказаў **начальнік Генеральнага штаба Узброеных Сіл — першы намеснік міністра абароны Віктар ГУЛЕВІЧ**, устанаўліваецца абавязак аператараў сувязі прадстаўляць звесткі аб абанентскіх нумарах карыстальнікаў паслуг электрасувязі з ліку грамадзян, якія стаяць на воінскім уліку, а таксама па апавяшчэнні іх у мірны і ваенны час з выкарыстаннем сістэм электрасувязі з дапамогай накіравання СМС-паведамленняў. Гэта, па яго словах, дазволіць забяспечыць аператыўнасць і максімальны ахоп давядзення да грамадзян, якія стаяць на воінскім уліку, інфармацыі аб неабходнасці яўкі на адпаведнае мерапрыемства па прызыве на ваенную службу, што ў выпадку ўзброенай агрэсіі супраць Рэспублікі Беларусь павысіць абараназдольнасць і нацыянальную бяспеку.

### БЛІЖЭЙ ДА ШАС

Дэпутаты ратыфікавалі шэраг міжнародных дакументаў. Сярод іх — Мемарандум аб абязацельствах Рэспублікі Беларусь з мэтай атрымання статусу дзяржавы — члена Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва. Як звярнуў увагу **старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах Палаты прадстаўнікоў Андрэй САВІНЫХ**, Беларусь працуе ў ШАС дастаткова даўно: першапачаткова ў статусе партнёра па дыялогу, цяпер у якасці назіральніка. «Па-першае, арганізацыя з'яўляецца інстытутам, які забяспечвае стабілізацыю і бяспеку ў рэгіёне вялікай Еўразіі, па-другое, адкрываюцца новыя перспектывы сацыяльна-эканамічнага і інвестыцыйнага супрацоўніцтва», — патлумачыў некаторыя прычыны цікавасці нашай краіны да ШАС дэпутат.

Андрэй Савіных падкрэсліў, што працэс уступлення Беларусі ў Шанхайскую арганізацыю супрацоўніцтва будзе праведзены ў кароткія тэрміны. «Такі хуткі алгарытм уступлення дзяржавы рэалізоўваецца ўпершыню, — удакладніў ён. — Перакананы, што размова ідзе аб месяцы, не больш».

На бягучы момант прыняты праекты аб ратыфікацыі 22 міжурадавых пагадненняў, неабходных для ўступлення ў ШАС. У агульнай колькасці плануецца ратыфікаваць да 50 дакументаў, якія ўжо дзейнічаюць у межах гэтай арганізацыі.

Як рэзюмаваў Андрэй Савіных, Беларусь ні ў адной арганізацыі не займае пасіўную пазіцыю. Уступленне ў ШАС, па яго словах, дасць новы штуршок дынаміцы развіцця. «Мы сапраўды зацікаўлены ў развіцці гэтай арганізацыі, бо гэта фактар стабілізацыі на нашым мацерыку», — падкрэсліў парламентарый.

**Вераніка КАНЮТА.**

Добрая навіна

# Па апошнім слове тэхнікі

## АПК Гомельшчыны ўзмоцнены новымі сельгасаб'ектамі

**Даільна-малочны блок і кароўнікі на 640 галоў дойнага статка: гэтыя сучасныя памяшканні для жывёл адкрылі ў КСУП «Слабадское імя Леніна» Мазырскага раёна. Буйны інвестпраект у рамках Указа Прэзідэнта рэалізаваны на базе малочнатаварнага комплексу паблізу населенага пункта Вялікія Зімовішчы. Павіншаваць мясцовых аграрыяў з важным этапам у развіцці гаспадаркі прыехалі старшыня аблвыканкама Іван КРУПКО, намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Леанід ЗАЯЦ, памочнік Прэзідэнта — інспектар па Гомельскай вобласці Юрый ГОРЛАЎ і старшыня Мазырскага райвыканкама Алена ПАЎЛЕЧКА.**

Будаўніцтва новых памяшканняў у гэтым аддзяленні гаспадаркі дазволіла перавесці ферму ў разрад малочнатаварнага комплексу. Тут плануюць утрымліваць да тысячы галоў дойнага статку. Усяго ў суткі ў гаспадарцы здаюць каля 36 тон малака, а дзякуючы ўводу новых вытворчых аб'ектаў мясцовыя аграрыі павысяць сутачны надой на 12-13 тон сыравіны.

Па словах **дырэктара КСУП «Слабадское імя Леніна» Юрыя БАЖАНКОВА**, новыя будынкі малочнатаварнага комплексу змогуць змясціць 640 галоў жывёлы.

— Наша гаспадарка аб'яднана з чатырох, старыя фермы паступова закрываем, пераводзім жывёлу і працаўнікоў у больш сучасныя блокі, — расказаў дырэктар КСУП «Слабадское імя Леніна».

Між тым гаспадарка на тэрыторыі Мазырскага раёна невыпадкова выбрана для рэалізацыі інвестпраекта з удзелам бюджэтных сродкаў. Рэгіён лідзіруе па ўдоі на адну карову ў вобласці, а па выніках сёлетняй работы ўвайшоў у тройку лідараў па гэтым паказчыку ў краіне.

Як адзначыў у час адкрыцця новых аб'ектаў Іван Крупко, інвестыцыйны праект на базе КСУП «Слабадское імя Леніна» дасць магчымасць сельгаспрадпрыемству павялічыць гадавую вытворчасць малака на 4 тысячы 800 тон і пры таварнасці 97 % забяспечыць дадатковую выручку ў суме 4,5 мільёна рублёў.

— Мы знаходзімся на этапе вялікай мадэрнізацыі ў сферы жывёлагадоўлі, — падкрэсліў старшыня аблвыканкама. — Да 2025 года вобласць павінна выйсці на вытворчасць 1,2 мільёна тон малака і 225 тысяч тон мяса. Для гэтага стаіць задача да 2030 года пабудаваць 44 новыя фермы і правесці мадэрнізацыю яшчэ 40 МТФ. Да канца гэтага года на Гомельшчыне ўвядзём у эксплуатацыю яшчэ восем сельгасаб'ектаў.

За сістэмнай работай па абнаўленні і развіццю вытворчай інфраструктуры гаспадаркі — рэальная эканоміка і стварэнне годных умоў працы для людзей.

Фота ТК «Гомельская афіцыйна».

— Ваша прадпрыемства з'яўляецца апорай для падрыхтоўкі кадраў, тут вучыцца моладзь, якую пасля прызначаем на кіруючыя пасады ў аграпрамысловы комплекс. Дзякуючы гэтай карпатлівай рабоце фарміруецца далейшае развіццё рэгіёна, — нагадаў губернатар.

З важным этапам на шляху развіцця ўласнай вытворчасці аграрыяў Мазырскага раёна павіншаваў віцэ-прэм'ер Леанід Заяц.

— Праграма Прэзідэнта разлічана да 2025 года, усяго ў краіне ўзводзіцца больш за 170 аб'ектаў. Усе фермы будуць ператвораны ў малочнатаварныя комплексы, дзе ручная праца зводзіцца да нуля, а прадукцыйнасць павялічваецца. Менавіта ў развіццё аграпрамысловага комплексу ўкладваюцца вялізныя сумы. З разлікам на тое, каб цяперашняе пакаленне і маладыя людзі, якія прыйдуць на змену, змаглі скарыстацца гэтым, каб яны кармілі свой народ і прадавалі лішкі вытворчасці, — дадаў Леанід Заяц і падзякаваў працаўнікам на вёсцы за іх клопат аб харчовай бяспецы краіны.

— Мы вырабляем на нашых палях, на нашых фермах менавіта тое, што сёння карыстаецца вялікай папулярнасцю ў спажыўца. Лішкі паспяхова прадаём на замежных рынках. Толькі па выніках работы за дзевяць месяцаў экспарт склаў каля пяці мільярдаў долараў. За гэтымі лічбамі каласальная праца нашых земляробаў, работнікаў жывёлагадоўчых комплексаў і ферм, механізатараў, органаў дзяржаўнага кіравання, спецыялістаў, — падкрэсліў віцэ-прэм'ер.

Як адзначыў памочнік Прэзідэнта — інспектар па Гомельскай вобласці Юрый Горлаў, беларускія аграрыі могуць дастойна дэманстраваць самыя сучасныя тэхналогіі вытворчасці на сусветным узроўні.

— У нас многія вучацца, ураняюць нашы тэхналогіі. Гэты малочнатаварны комплекс абсталяваны па апошнім слове тэхнікі. Спадзяюся, вы будзеце павышаць прадуктыўнасць, дзякуючы чаму будзе расці дабрабыт вашых сем'яў, — заключыў Юрый Горлаў.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

Па сутнасці

# Сафары дэмакратыі

Для мяне мужчынскім ідэалам быў дзед. Праз пару соцень метраў ад нас стаяла дзедава хата. Франтавік і разведчык, ляснік, залiхвацкі прафесіянал у сваёй справе. Для мяне — ідэал. Я быў не толькі сын свайго бацькі, але і, напэўна, больш унук свайго дзядулі. Таму найлепшай пахвалой было, калі мне казалі пра падабенства з дзядулем. Бывала, малым стаю ў вясковай царкве, нібы тая свечка, а бабулі перашэптваюцца: «Вось Ванькаў унук». Дзед канарыўся мной, а я — ім. Мне ва ўсім хацелася быць на яго падобным. Толькі вось я так і не змог стаць паляўнічым. Не маё гэта, не падымаецца рука забіць звера ці птушку...

А ёсць жа людзі і нават краіны, што палююць на людзей. Я зараз не толькі пра сафары «айцоў заходняй дэмакратыі» на людзей з іншым колерам скуры, на якое яны выходзяць не першае стагоддзе. Я пра нашых суседзяў. Што яны вырабляюць з мігрантамі і бежанцамі на граніцы. Памятаеце, як у фільме Рома кінаплёнка бегла назад у мінулае. Вось і я ўяўляю такое. Здаецца, не было ні Нюрнбергскага працэсу, ні розных там канвенцый. Назад — да дзікунскіх звычак. Вось бялявы з блакітнымі і бязлітаснымі вачыма эсэсавец кідае немаўля ў вогнішча. Круцім плёнку далей. Крыжаносец падносіць паходню да драўляных сцен невялікай царквы, у якой закатаваны нашы продкі. Няўжо нічога не змянілася?..

Я не маю права разважаць, хто большы НЕчалавек. Той, хто гэта здзяйсняў, аддаваў загады, старанна вылічваў, колькі індзейцаў, абарыгенаў альбо славян патрэбна пакінуць на іх спрадвечнай зямлі? Той, хто загадваў скідваць бомбу «малыш» на японскіх дзяцей? Той, хто руйнаваў дамы югаславаў, вынішчаў жыхароў Блізкага Усходу, Афрыкі?

Паважаны чытач, беларус, ці ты можаш уявіць замест бялявага з блакітнымі і бязлітаснымі вачыма эсэсаўца савецкага салдата, ці нашага вайскойца? Мільёны разоў — не. «Не» са знакам бясконцасці. Адзін толькі помнік у берлінскім Трэптаў-парку адказвае на ўсе гэтыя пытанні. А вось яны так рабілі. Падобнымі займаюцца і цяпер. Як сказаў нядаўна Прэзідэнт: «Для іх гэта норма. Яны мярзотнікі, крыжакі. У гісторыі заўсёды было так».

Разважаць пра еўрапейскі гуманізм і пасміхацца з меркаванняў ваенных экспертаў пра дзікую міліторызацыю суседзяў не раю. Збеглыя медыя будуць вас упэўніваць: маўляў, гэта байкі прапаганды, гэта яны так запужаць грамадства спрабуюць. Лепш спытайце пра еўрапейскую гасціннасць у мігрантаў, якіх выгналі праз брамкі для жывёл на нашу тэрыторыю, — у тых, што засталіся жывымі, што страцілі нагу, руку альбо роднага бацьку, якога «цывілізаваныя еўрапейцы» забівалі на вачах... Зноў плёнка круцілася назад — гэта ўжо было. Добра экіпіраваныя ваенныя гоняць бездапаможных бяззбройных людзей насуперак іх волі. Сёння — выціскаюць з еўрапейскага «саду» мігрантаў. Гэта так нагадвае жудасныя кадры, знятыя Элемам Клімавым. «Ідзі і глядзі». Глядзі і параўноўвай. Нічога не змянілася. Але не, прабачце. Замест рыцараў жалезнага крыжа — польскія жаўнеры і латышскія ды літоўскія абаронцы. Маршы СС па вуліцах Рыгі дарма не прайшлі. Вось яно — сапраўднае аблічча заходняй цывілізацыі. У гэтых фактах схавана цэлая тэндэнцыя. Даруйце, філасофія. Палявання на «ўнтэр мэншэн». Яно адбываецца па-рознаму. Ментальнае — за сэрцамі і душамі, прамое — за жыццямі людзей.

І, што цікава, пакуль беларускія пагранічнікі баранілі межы ЕС ад тых жа мігрантаў — не было ні памерлых, ні забітых, ні замарожаных. Але «праваабаронцы» пільна за ўсім сачылі, каб не дай бог што... А дзе тыя праваабаронцы цяпер? Чаму не бачаць, не б'юць ва ўсе званы з усіх трыбун, што нашы суседзі настолькі страцілі сумленне, што нават проста памерлых выкідваюць на беларускую тэрыторыю. Насамрэч усе яны страцілі і культуру, і Бога, і нават сябе. І някай колькі заўгодна некаторыя гаворачь пра іх з прыдыханнем «Еўропа!», іх справы, іх дзеянні і бяздзейнасць сведчаць пра іншае — звычайныя дзікуны.

Ідзі і глядзі. Глядзі і параўноўвай. Што яшчэ не зразумела, прамым тэкстам нам ужо сказана: ёсць «сад» і «джунглі». Жыхары «саду» ходзяць палююць на тых, хто з «джунгляў». Такое яно — сафары дэмакратыі.

**Яўген ПУСТАВОЙ.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Паліцыя ўжыла вадамёт на беспарадках у Гамбургу

У Гамбургу адбыліся беспарадкі ўвечары на Хэлаўін, паліцыі прыйшлося прымяніць вадамёт, паведаміла нямецкая служба навін Tagesschau. Беспарадкі назіраліся ў раёне Харбург, дзе сабралася ад 150 да 200 чалавек, у асноўным моладзь. Пазней колькасць павялічылася да 300—350 чалавек. Адзначаецца, што прысутныя кідалі петарды і бутэлькі ў натоўп, а таксама ў службы экстраннай дапамогі. Некалькі чалавек атрымалі раненні. Паліцыя змагла ўзяць сітуацыю пад кантроль, толькі калі прыбыло падмацаванне. Праваахоўнікі для разгону натоўпу ўжылі вадамёт. Вялікі кантынгент сілавых структур быў разгорнуты па ўсім горадзе. Адзначаецца, што беспарадкі таксама фіксаваліся ў Лурупе, Асдорфе і Штайльсхаопе. Так, у беспарадках у Лурупе, паводле даных паліцыі, удзельнічалі каля 50 маладых людзей. Яны падрывалі петарды, пашкодзілі вітрыны крамы і падпалілі смеццевыя кантэйнеры. У раёне Асдорфа сабралася каля 70 чалавек, у Штайльсхаопе — каля 100.

### Ілан Маск заявіў, што Еўропа знаходзіцца на шляху да грамадзянскай вайны

У сацсетках амерыканскі прадпрымальнік напісаў, што Еўропа рухаецца да грамадзянскай вайны. Пра гэта паведаміла ТАСС. Каментарый пра набліжэнне Еўропы да грамадзянскай вайны Маск пакінуў пад відэа, на якім мігрантка спальвае сцяг Францыі. Карыстальнік, да запісу якога дадаў каментарый амерыканскі бізнесмен, не задаволены міграцыйнай палітыкай Еўропы і заклікае вярнуць мігрантаў назад на радзіму. Ілан Маск ужо раней выказваў падобны пункт гледжання. Ён заяўляў, што Еўропе можа пагражаць грамадзянская вайна, калі яна не ўнясе карэктывы ў сваю міграцыйную палітыку. Раней кіраўнік Еўракамісіі Урсула фон дэр Ляен паведаміла, што ў мінулым годзе ў Еўрасаюз прыбыла больш за 3,7 мільёна легальных мігрантаў і 330 тысяч нелегальных.

### Кітай адмяніў абавязковыя для ўезду дэкларацыю здароўя і QR-код

З 1 лістапада ў Кітаі спрасцілі працэдуру санітарнага кантролю на граніцы. Адмянілі патрабаванне да замежных грамадзян прад'яўляць пры ўездзе дэкларацыю аб стане здароўя. Аб гэтым паведаміла галоўнае мытнае ўпраўленне краіны. Патрабаванне дзейнічала з пачатку пандэміі. Таксама падарожнікам не трэба атрымліваць спецыяльны QR-код для ўезду ў Кітай. Запаўняць дэкларацыю павінны будуць толькі пасажыры з сімптомамі інфекцыйных захворванняў, напрыклад, з кашлем, высокай тэмпературай. Як вядома, з 30 жніўня ў Кітаі не патрабуюць у тых, хто ўязджае, адмоўны вынік тэста на COVID-19.

Рабі дабро

# Клапаціцца будзем разам

## Адрасатамі дабрачыннай акцыі ў Гомелі сталі амаль 250 пенсіянераў

**У Гомелі прайшла акцыя «Час клопату». Упершыню маштабнае мерапрыемства для пажылых людзей і інвалідаў сумесна правялі Гомельская абласная арганізацыя Беларускага Чырвонага Крыжа і цэнтральная гарадская паліклініка.**

У фае Гомельскага гарадскога цэнтра культуры пераключчык мовы жэстаў дапамагае ўрачу-тэрапеўту весці незвычайны прыём. Прамы і зваротны жэставы пераклад для зносін доктара і чалавека, які звярнуўся, патрабуе часу. Побач з імправізаванай лакацыяй для прыёму чарга з пацыентаў з асаблівасцямі слыху і маўлення.

— Мы ўпершыню арганізавалі такую паслугу па бясплатнай кансультацыі ўрача для пенсіянераў з праблемамі слыху і маўлення. Не чакалі, што столькі пажылых гамяльчан адгукнецца на нашу прапанову, — тлумачыць **галоўная медыцынская сястра Гомельскай абласной арганізацыі БЧК Марына КУНДАС.**

Тым часам у фае Чырвоны Крыж уладкаваў кансультатыўныя лакацыі для цэлага шэрагу профільных спецыялістаў. Арганізатары пастараліся размясціць урачоў такім чынам, каб пры размове ніхто адзін аднаму не перашкаджаў. Уладкавалі тут і месца для правядзення ўльтрагукавой дыягностыкі Гомельскай гарадской клінічнай паліклінікі № 3 Людміла Коцур. Медпаслуга спецыяліста падчас акцыі стала адной з самых папулярных.

— Таксама правялі кансультацыі хірург, дэрматолаг, неўролаг, эндакрынолаг, анколаг. Пасля агляду ўрача агульнай практыкі ахвочыя змаглі прышчапіцца ад грыпу, — дадала Марына Кундас.

Прыём урачы пачалі з 10 гадзін раніцы і вялі да трох гадзін дня, пры гэтым паток пенсіянераў, якія жадалі прайсці абследаванне, атрымаць кансультацыю, не спыняўся.

— Вельмі хацела прайсці дэрматолага. Атрымала кансультацыю і накіраванне на далейшае абследаванне. Я ўпершыню прыняла ўдзел у такой акцыі, і акрамя кансультацыі спецыялістаў пазнаёмілася больш і з працай самога Чырвонага Крыжа, — падзялілася ўражаннямі гамяльчанка Ганна Чапчур.

Антаніна Пугачова пасля выхаду на пенсію некалькі гадоў таму стала валанцёрам Навабеліцкай раённай арганізацыі Беларускага Чырвонага Крыжа. Жанчына заахвоціла прыняць удзел у акцыі сваіх сяброў і знаёмых. Валанцёры залатога ўзросту, дарэчы, падчас акцыі прадставілі сваю асобную лакацыю. На ёй можна было ацаніць вынікі работы творчай майстэрні, дзе пенсіянеры шыюць, вяжуць, рамантуюць адзенне, робяць сувеніры.

— Такі кірунак дзейнасці як валанцёрства людзей залатога ўзросту ў апошнія гады карыстаецца вялікай папулярнасцю на Гомельшчыне. Напрыклад, толькі творчыя майстэрні нашых валанцёраў працуюць акрамя Гомеля ў Светлагорску і Жлобіне. Для ўдзелу ў акцыі «Час клопату» нашы актывісты прынеслі свае вырабы і арганізавалі дабрачынную латарэю. Сваім прыкладам валанцёры паказваюць, што такое актыўнае сталенне, — зазначыла **спецыяліст Гомельскай абласной арганізацыі БЧК Вольга НОВІКАВА.**

Увогуле арганізатары прадставілі ўдзельнікам акцыі самыя розныя сэрвісы. Акрамя кансультацый арганізавалі прафілактычную і дыягнастычную лакацыі. Госці атрымалі памяткі аб харчаванні, фізічнай актыўнасці, прафілактыцы хвароб, пазнаёміліся з паслугамі пункта здароўя.

— Усе жадаючыя змаглі вызначыць свой індэкс масы цела, памераць ціск, сатурацыю. Вельмі папулярнай паслугай стаў апаратны масаж ног і спіны. Такім чынам мы яшчэ і прадставілі новае абсталяванне нашага пункта здароўя, які не так даўно адкрыўся ў Гомелі. Паслуга па апаратным масажы даступна для гамяльчан ва ўзросце ад 50 гадоў, людзям з інваліднасцю, якія не маюць патрэбу ў надомным абслугоўванні, — патлумачыла **супрацоўнік Навабеліцкай раённай арганізацыі Беларускага Чырвонага Крыжа Валянціна ЛЕНАЯ.**

Спецыялісты Чырвонага Крыжа, акрамя таго, правялі майстар-класы па аказанні першай медыцынскай дапамогі.

— У рамках рэспубліканскай дабрачыннай кампаніі «Ваша дапамога», якую праводзіць Чырвоны Крыж на працягу некалькіх месяцаў, мы ў Гомелі вырашылі арганізаваць акцыю «Час клопату», — распавяла спецыяліст Гомельскай абласной арганізацыі БЧК Вольга Новікава. — Ідэя ўпершыню далучыцца да акцыі спецыялістаў медыцынскіх устаноў стала вельмі актуальнай, улічваючы попыт на медпаслугі асабліва людзей пажылога ўзросту. У пенсіянераў, людзей з інваліднасцю з'явілася магчымасць пракансультавацца з урачамі і не чакаць талонаў і чэргаў у паліклініках.

Дарэчы, спецыялісты раённых арганізацый Беларускага Чырвонага Крыжа загадзя раздалі 200 флаераў з запрашэннямі на акцыю. Акрамя таго да пачатку акцыі людзі звязваліся па тэлефоне і цікавіліся, якім чынам можна трапіць на мерапрыемства. Многія адзначылі, што хацелі б бліжэй пазнаёміцца ў тым ліку з дзейнасцю грамадскай арганізацыі. У цэлым жа ўдзельнікамі акцыі «Час клопату» ў Гомелі сталі амаль 250 гамяльчан.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА, фота аўтара.**

# Калідор да мора і падлік пасажыраў

## «Электрычны» ўхіл

У Беларусі каля 41 тысячы аўтобусаў, амаль 30 тысяч з якіх належаць арганізацыям. Транспартам агульнага карыстання ў асноўным валодаюць камунальныя прадпрыемствы (каля 5700 аўтобусаў, 1425 тралейбусаў, 275 трамвайных вагонаў). 39 тысяч арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў маюць ліцэнзіі на дзейнасць у галіне аўтамабільнага транспарту, паведаміў **Андрэй ГЛАДКІ, начальнік упраўлення аўтамабільнага і гарадскога пасажырскага транспарту Міністэрства транспарту і камунікацый:**

— Аўтамабільны транспарт у сукупнасці з гарадскім электрычным і метрапалітэнам перавозіць каля 96 % пасажыраў ад агульнай колькасці людзей, якія перамяшчаюцца ўсімі відамі транспарту. Аўтамабільным транспартам пры гэтым ездзіць да 60 % людзей ад агульнага аб'ёму пасажыраперавозак — больш як 90 % гэтага аб'ёму перавозіцца транспартнымі сродкамі арганізацый транспарту агульнага карыстання.

Упор у краіне робіцца на развіццё электрыфікаванага транспарту (электробусаў, тралейбусаў на аўтаномнай хадзе). Па выніках пілотных праектаў у Жодзіне і Шклоўскім раёне спецыялісты разгледзяць, які эфект атрымліваецца ад развіцця электратранспарту ў параўнанні з аўтамабільным, пасля чаго гэтыя навацыі распаўсюдзяць на іншыя гарады Беларусі.

Асноўная частка работ па праектах, якія рэалізоўваюцца адпаведна з пастановай Саўміна № 505, дзе вызначаны два гэтыя месцы, запланавана на 2024 год. Будуць пастаўлены транспартныя сродкі на электрычнай цязе айчынных вытворцаў, якія, як плануецца, заменяць усе пасажырскія сродкі перамяшчэння ў Жодзіне і Шклове, удакладніў начальнік упраўлення:

— Нам неабходна будзе ацаніць затраты, якія ўзнікаюць у сувязі з эксплуатацыяй такога віду транспарту ў параўнанні з аўтамабільным («электрычны» транспарт даражэйшы за звычайныя аўтобусы). Вядома, што першапачаткова затраты будуць вышэйшыя, бо патрэбна і будаўніцтва зарадных станцый, і пракладка камунікацый для станцый. Пазней ацэнім, як паводзяць сябе ў эксплуатацыі гэтыя сродкі, і на пачатку 2025 года будзем ужо разумець, наколькі эфектыўна і мэтазгодна эксплуатацыя электратранспарту і ці будзе праект маштабаваны па краіне.

## Наземныя, падземныя і лічбавыя кіламетры сталіцы

У сталіцы 313 маршрутаў гарадскога наземнага транспарту працягласцю больш за тры тысячы кіламетраў і звыш 40 кіламетраў трох ліній Мінскага метрапалітэна, падзяліўся **Андрэй ІЛАРЫЁНАЎ, намеснік дырэктара — начальнік управлення пасажырскіх перавозак прадпрыемства «Сталічны транспарт і сувязь» Мінгарвыканкама:**

— У час пік на гарадскія пасажырскія маршруты выходзяць 867 аўтобусаў, 548 тралейбусаў, 89 трамваяў і 64 саставы метрапалітэна. Сёлета праведзены шэраг мерапрыемстваў па аптымізацыі маршрутнай сеткі. Арганізавана пяць новых маршрутаў, унесены змены ў схему руху яшчэ 12 маршрутаў, на 14 адкарэкціраваны расклад руху, на васьмі павялічылі колькасць рухомага саставу, на шэрагу маршрутаў арганізаваны дадатковыя прыпыначныя пункты і рэйсы. На маршрутах зменена марачнасць.

Работы па аптымізацыі маршрутнай сеткі працягваюцца. У прыватнасці, актыўна займаюцца пытаннем новага мікрараёна «Мінск Свет» — у сувязі з будучым пускам метрапалітэна разглядаюцца варыянты рэарганізацыі маршрутнай сеткі. У найбліжэйшы час транспартнікі хочуць публічна прадставіць на абмеркаванне схему руху, якую прапануюць для рэалізацыі.

Транспартнікі займаюцца таксама аўтаматызаваным вывучэннем пасажырапатоку на рухомым саставе. Гэта робіцца з дапамогай інфрачырвоных датчыкаў, а таксама камер, усталяваных у салонах пасажырскага транспарту, удакладніў Андрэй Іларыёнаў:

— Аналізуем відэаматэрыялы, якія атрымліваем, і паглыблена вывучаем магчымасці лічбавых тэхналогій, каб у будучыні выкарыстоўваць іх. Стараемся палепшыць якасць паездак пасажыраў.

Прадпрыемства «Белдарсувязь» вызначана адказным за пытанні лічбавізацыі ў дарожным кірунку. Распрацоўваюцца лакальныя дакументы Мінтранса аб тым, што такое інтэлектуальныя транспартныя сістэмы, як яны працуюць, хто з кім узаемадзейнічае і якімі данымі абменьваецца, для чаго гэта патрэбна і наколькі эфектыўна. Работа вядзецца сумесна з ДАІ і МУС, каб аптымізаваць работу дарожнікаў з дапамогай лічбы.

## Мільярды на дарожную «вопратку»

Дарожны комплекс краіны развіваецца ў рамках дзяржпраграмы «Дарогі Беларусі на 2021—2025 гады». Сёлета на ўсе айчынныя дарогі (рэспубліканскага і мясцовага значэння) мяркуецца выдаткаваць 1,4 млрд рублёў на бягучы і капітальны рамонты, узвядзенне і рэканструкцыю дарог агульнага карыстання, расказаў **Сяргей ЛЯВОНЧЫК, намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення аўтамабільных дарог Міністэрства транспарту і камунікацый:**

— На сёння ў рэспубліканскай сеткі рэканструюецца дарога Р46 у напрамку ад Лепеля да Полацка. Участак увядуць у эксплуатацыю да канца 2026-га. Калідор па дарозе Р46 ключавы на сённяшнім этапе развіцця аўтадарог, таму што вядзе ў бок портаў Санкт-Пецярбурга, Ленінградскай вобласці і з'яўляецца асноўным транзітным шляхам для зносін з Расіяй з выхадам да мора. На гэтым жа калідоры знаходзіцца дарога М3 Мінск — Віцебск, якая таксама актыўна рэканструюецца, — у 2024-м мы ўвядзём участак гэтай дарогі ад Лагойска да Плешчаніц у цэментна-бетонным выкананні. З выкарыстаннем цэменту рэканструюецца і дарога Р53 — участак ад Смалявічаў да Жодзіна плануецца здаць у 2024-м і працягнуць работы на ўчастку ад Жодзіна да Барысава.

Па некаторых праектах дарожнікі пераключыліся на бюджэтнае фінансаванне і не разглядаюць замежную дапамогу ці крэдыты. Прынята рашэнне ўсе аб'екты ў краіне ўзводзіць за кошт бюджэту, удакладніў Сяргей Лявончык:

— Гэта ўзважаная пазіцыя, але ж мы не пакідаем магчымасць выкарыстоўваць міжнародныя фінансавыя інстытуты для прыцягнення заёмных сродкаў. Калі будуць выгадныя прапановы для краіны ў плане крэдытаў, то будзем браць іх і рэканструяваць дарогі. У Беларусі 1787 кіламетраў платных дарог (плата індэксуецца адпаведна з умовамі інвестдагавораў). Аплата на новых участках дарог будзе ўводзіцца па меры іх рэканструкцыі і давядзення параметраў шляхоў да першай катэгорыі.

Сёння вялікая ўвага ўдзяляецца таксама развіццю маставой гаспадаркі. Некалькі гадоў таму былі абследаваны ўсе масты, якія патрабуюць неадкладных работ і рамонту. У перспектыўны план унесены работы з 2022 да 2025 года. Летась адрамантавалі 80 маставых збудаванняў (50 — на рэспубліканскіх дарогах, 30 — на мясцовых). Сёлета рамонтам будзе ахоплена 119 мастоў.

Задача дарожнікаў — зрабіць так, каб людзі ганарыліся дарогамі, якія існуюць у краіне, і на сабе адчулі работу, што вядзецца спецыялістамі, тым больш гэта ўплывае на павышэнне камфорту і бяспекі, а таксама працуе на эканоміку.

**Ірына СІДАРОК.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

### Перавозчык, транспарт і кіроўца — у рэестр

Для ўдасканалення якасці, бяспекі і касавай дысцыпліны пасажыраперавозак на аўто-таксі, у тым ліку заказаных праз мабільныя праграмы, падрыхтаваны праект указа Прэзідэнта, які цяпер узгадняецца ў Адміністрацыі кіраўніка дзяржавы.

Дакументам прадугледжана стварэнне рэестра аўтамабільных перавозчыкаў, у які ўвойдуць звесткі як пра перавозчыкаў, так і пра транспарт, дзе ажыццяўляецца паслуга перавозкі, а таксама пра кіроўцаў такіх таксі. Дадатковых патрабаванняў для перавозчыкаў пры гэтым не прадугледжана.

Пасля адмены ліцэнзавання для перавозчыкаў-таксістаў у 2018 годзе цяпер немагчыма прымяніць меры ўздзеяння да нядобрасумленных удзельнікаў рынку перавозак. Таму будзе прадугледжаны і механізм выключэння з рэестра за пэўныя парушэнні і неадпаведнасць патрабаванням правіл перавозкі.

Яшчэ адна навацыя ўказа — усе дыспетчары таксі павінны быць зарэгістраваны на тэрыторыі Беларусі як юрыдычныя асобы. Тэхнічныя сродкі і інфармацыйныя сістэмы таксама павінны знаходзіцца на тэрыторыі нашай краіны, каб у выпадку няякаснага аказання паслугі пасажыр ведаў, куды звярнуцца для ўрэгулявання праблемы.

Сямейная газета

Выпуск № 19 (222)

# ЦЯГНІСЯ ДА СВЯТЛА!

*Позняй восенню і ўзімку, калі сонца радуе ўсё радзей і радзей, здаецца, што вокны ў доме чыстыя. Але ў тыя рэдкія хвіліны, калі яно выглядвае і пачынае праз шкло казытаць твар сваімі праменьчыкамі, я заўважаю ўсе плямы і разводы. У такія моманты хочацца ўзяць вільготную анучу, а потым старую газету і нацерці іх да бляску, каб у куханьку трапляла як мага болей святла. Тое ж самае і з душой...*

*Год шаснаццаць таму я ехала ў аўтобусе ва ўніверсітэт на экзамен пасля бяссоннай ночы. Дабірацца трэба было хвілін 50, таму сама не заўважыла, як задрамала. Разбудзіў мяне гучны голас, поўны абурэння: «Ну і моладзь пайшла, нават месца не могуць саступіць...» Расплюшчыла вочы і ўбачыла, што нада мной навісае незадаволеная кабета з поўнымі пакетамі. Я, канешне ж, хуценька падхапілася са свайго месца, але яна ўсё адно працягвала выліваць на мяне ўвесь свой ранішні негатыў. Тады я прамаўчала... І хадзіла цэлы дзень з непрыемным асадкам у душы.*

*Гэтую гісторыю згадала, калі днямі пасля працы зайшла ў краму, каб узяць штосьці перакусіць, пакуль чакала сяброўку. Працягнула на касе дысконтную картку касірцы. На што тая буркнула, маўляў, вы, што, толькі нарадзіліся, ужо больш як год пакупнікі прыкладаюць яе самі. «Дзякуй, што нагадалі», — усміхнулася я ёй у адказ, аплаціла свае смятаннік з сокам і пайшла. Прычым злавіла сябе на думцы, што на душы ў гэты момант не было ніякага асадку.*

*«Не ўпускайце негатыў унутр сябе, — любіць паўтараць мая знаёмая, інструктар па ёзе Святлана. — Калі раптам хтосьці вас пакрыўдзіў (незнаёмая жанчына ў транспарце ці ў чарзе альбо калега на рабоце), паспрабуйце адчуць, як гэтаму чалавеку дрэнна, пашкадаваць яго ў думках і шчыра пажадаць, каб у яго ўсё наладзілася. Калі ж «пражоўваць», «смакаваць» усё, што на вас «вылілі», па некалькі разоў прагаворваючы гэта маме, мужу, сяброўцы, то вы такім чынам разбураеце сябе. Не паддавайцеся імгненным эмоцыям, старайцеся абстрагавацца ад негатыву. Я ў такія моманты проста заплюшчваю вочы, усміхаюся і прагаворваю пра сябе як мантру: «Я жыву ў сваім мірным свеце, я ёсць любоў, я ёсць спакой». Не ўпускаць негатыў унутр сябе складана толькі спачатку, а потым гэта ўвойдзе ў звычку, і вы будзеце рабіць гэта, як і я, на аўтамаце».*

*Сёлета я вырашыла пасадзіць на зіму не толькі часнок, але і цыбулю. Папрасіла мужа купіць грамаў 100—200 сеянца. Ён, відаць, не пачуў, і прывёз з горада ажно цэлы кілаграм. Я спачатку засмуцілася. Маўляў, навошта так шмат, што я з ім буду рабіць. А потым «уключыла» пазітыўнае мысленне і падзякавала мужу за гаспадарлівасць. Бо можна ж частку таго сеянца рассадзіць на агародзе, а тое, што застанецца, пакрысе ўторкваць у кантэйнеры для яек і вырошчваць зеляніну на падаконніку ўсю зіму. Расце ж вунь у мяне базілік у гаршку, будзе і свежая цыбулька радаваць.*

*«Бабуля заўсёды ставіла на падаконнік хоць травінку ў шклянцы, хоць галінку, хоць цыбулінку... І ўсё расло... — чытаю ў псіхолага Лілії Град. — Яна жвава хадзіла па кухні, сухенькая, сівая, паспяваючы маланкава нашаткаваць капусту, наладзіць квас з перапаленым сухарыкам, разабраць курыцу... Спявала пры гэтым... Але часам брала ў рукі шклянку з травінкай і доўга глядзела на яе... Калі я спытала, чаму яна так любіць гэта рабіць, бабуля проста адказала: — Так я набіраюся сілы жыць... Бачу кветку, былінку, зялёную стрэлку цыбулі і цягнуся, як і яны, ухапіць свой кавалачак святла... Кавалачак святла, які падымае ўверх кволую травінку... Так уладкавана жыццё... Цягніцеся да святла... Заўсёды...»*

***Надзея ДРЫНДРОЖЫК.***

Тыя, хто побач

## Андрэй БАРБАШЫНСКІ:

# «Для сваіх дзяцей я не алімпійскі чэмпіён, а найперш сябар і бацька»

**У 1992 годзе на Алімпійскіх гульнях у Барселоне ў спаборніцтвах па гандболе перамагла Аб'яднаная каманда, сабраная хоць і з таленавітых, але маладых і неабстраляных гульцоў. У гэтую каманду не верыў ніхто. А яны сталі алімпійскімі чэмпіёнамі. Адным з герояў той неверагоднай гісторыі быў 22-гадовы Андрэй Барбашынскі. Уявіць айчынны гандбол без «беларускага волата», як яго часта называюць журналісты, немагчыма. Сваю спартыўную кар'еру Андрэй Барбашынскі даўно скончыў, але па іроніі лёсу, на гандбольнай пляцоўцы на пазіцыі лінейнага зноў Барбашынскі, праўда, ужо малодшы. Мацвей Барбашынскі, старэйшы сын чэмпіёна, у жніўні разам з камандай БДУФК-СКА-РГУАР стаў чэмпіёнам II Гульняў краін СНД. А малодшы з Барбашынскіх, Захар, сур'ёзна займаецца баскетболам. Дарэчы, у тым жа вучылішчы алімпійскага рэзерву, дзе пачынаў свой спартыўны шлях і яго бацька. Можна доўга разважаць, як прыклад бацькоў уплывае на дзяцей. А можна проста расказаць гісторыю гэтай сям'і. Што Андрэй Барбашынскі і зрабіў для «Сямейнай газеты», а заадно падзяліўся сваімі рэцэптамі выхавання сыноў.**

*(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)*

Сям'я Барбашынскіх. Фінал Гульняў краін СНД.

Умелыя ручкі

# Гірлянда з лісцікаў, штучны снег і фокус з паветраным шарыкам

## Чым заняцца з дзецьмі ў халады

**Калі ўлетку пытанне, чым заняць дзяцей, амаль не ўзнікала (яны суткі напралёт бавілі час на вуліцы), то з наступленнем халадоў яно стала актуальным. Чым зацікавіць сучасных хлопчыкаў і дзяўчынак, каб яны не нудзіліся і хоць на нейкі час забыліся на свае гаджэты? Па падказку мы звярнуліся да Надзеі АКСЁНЕНКІ, якая вядзе навуковы гурток у цэнтры інавацыйнай псіхалогіі «Одари».**

### Кансервуем... «восень»

Хтосьці кансервуе агуркі ды памідоры, а Надзея раіць паспрабаваць закансерваваць... яркае восеньскае лісце. Зрабіць гэта нескладана. Вам спатрэбіцца: гліцэрын (прадаецца ў любой аптэцы, каштуе танна), вада, пластыкавыя кантэйнеры ды папяровыя ручнікі. Збярыце падчас сумеснай прагулкі з дзецьмі прыгожыя рознакаляровыя лісцікі і пакладзіце іх у пластыкавы кантэйнер. Затым змяшайце адну частку гліцэрыну і дзве часткі гарачай вады. Выліце раствор на лісцікі. Каб яны не ўсплывалі, пастаўце зверху кантэйнер меншага памеру і прыцісніце каменьчыкамі. Праз 2-3 дні праверце: калі лісцікі набубмацак мяккія і эластычныя — можна даставаць іх з раствору (калі не — пакідайце яшчэ на пару дзён), прамакнуць сурвэткамі і раскласці па адным сушыцца на папяровых ручніках (на газетах гэта рабіць не рэкамендуюць).

Фота Надзеі ДРЫНДРОЖЫК.

*(Заканчэнне на 5-й стар. «СГ».)*

# ДЗЯКУЙ, ТАТКА, ЗА ЎСЁ!

**ТАТЫ бываюць розныя. Вясёлыя і сур'ёзныя. Летуценнікі і рэалісты. Танцоры і гітарысты. Стрыманыя і адкрытыя. Здаравякі і хваравітыя. Прыхільнікі вандровак і дамаседы. Маўчуны і аматары гучнай бяседы. Паголеныя, барадатыя... І ў чымсці крыху вінаватыя... Словам, таты бываюць розныя. Але аб'ядноўвае іх адно: бацькоўскія пачуцці, безумоўная любоў да сваіх дзяцей. А што дзеці? Давайце даведаемся. Мы папрасілі вядомых артыстаў расказаць пра сваіх татаў.**

## Дзяніс ЯНЦЭВІЧ: «Тата заўсёды браў мяне ў сваю кампанію»

*Саліст Вялікага тэатра Беларусі Дзяніс Янцэвіч — патомны музыкант. Ён упэўнены, што бацька паўплываў не толькі на выбар прафесіі, але і на паспяховасць у ёй.*

Дзяніс ЯНЦЭВІЧ з татам.

— Мой тата — прафесійны музыкант, баяніст, дырыжор, як ён жартуе: «Я вучыўся ў Ленінградзе, сын — у Пецярбургу». Дзед па татавай лініі — скрыпач-самавучка. Безумоўна, асяроддзе, у якім я рос, паўплывала на мой выбар прафесіі.

Колькі памятаю сябе, тата заўсёды браў мяне ў сваю кампанію, няхай гэта лазня ці рыбалка. Сябры казалі яму: навошта малога цягаеш за сабой? А тата адказваў: «Няхай бачыць, якія людзі вакол, як мы кантактуем».

Мае бацькі жывуць у Маладзечне, у іх прыватны дом. Быў перыяд, калі вядзенне падсобнай гаспадаркі з'яўлялася жыццёвай неабходнасцю. Мая мама-эканаміст і тата-музыкант трымалі хатніх жывёл, займаліся агародам, садам. У мяне таксама былі розныя абавязкі, напрыклад: прыйшоўшы са школы, я павінен быў пакарміць кабанчыкаў, курэй і качак.

У сям'і было непарушнае правіла: вячэраем усе разам, абмяркоўваем, як прайшоў дзень. Стаўшы дарослым, я зразумеў мудрасць сваіх бацькоў: дзіця павінна быць уцягнутае ў справы сям'і, яго голас таксама павінен быць пачуты.

Назіранні за тым, як размаўляюць розныя людзі, звычка да працы вельмі дапамаглі мне, калі вучыўся ў Санк-Пецярбургскай кансерваторыі. Трэба было неяк сябе забяспечваць, таму амаль усе іншагароднія студэнты шукалі падпрацоўку. Я не баяўся ніякай працы. Вяршыня маёй немузычнай кар'еры — афіцыянт у элітным рэстаране. Як элегантна падаваць стравы — навучаць, а вось бесканфліктна і з годнасцю мець зносіны з наведвальнікамі — гэта дзякуючы тату і яго сябрам.

Але да навучання ў кансерваторыі мог і не дайсці. На першых курсах у музычным вучылішчы мне было лёгка дзякуючы здольнасцям. А вось ужо на трэцім курсе такая праграма, што яе, як кажуць, трэба выседзець і вывучыць. Я ж спадзяваўся на здольнасці і скаціўся да «троек». Неяк увечары тата кажа: «Вось інструмент, але ты да яго больш не дакранайся. Я не хачу, каб маё прозвішча гучала са знакам мінус. Калі ты абраў музыку, значыць, рабі добра ці ніяк». Праз пару дзён паабяцаў тату, што ўсё выпраўлю. Слова стрымаў: усе іспыты здаў на «пяцёркі».

Цяпер я сам тата. Шчаслівы, што мой сын сябруе са сваім дзядулем. З досведу маіх бацькоў перанёс у сваю сям'ю ўцягнутасць дзіцяці ў агульныя справы. Мы з жонкай даём сыну нейкія заданні, якія адпавядаюць яго шасцігадоваму ўзросту, і яму падабаецца адчуваць сваю значнасць як частка нашай сям'і.

У сына ёсць здольнасці да музыкі, пачуццё рытму ў яго нават лепшае, чым у мяне. На гастролі я імкнуся ездзіць разам з сям'ёй. Там сын уладкоўваецца побач з пультам гукарэжысёра, яму падабаецца глядзець спектакль з-за куліс. Я не прымушаю сына займацца музыкай, разумеючы, што нашу прафесію варта выбіраць толькі тады, калі па-іншаму проста не можаш.

## Кацярына МІШЧАНЧУК: «Кветкі тата дорыць мне з дзяцінства!»

*Летась у інтэрв'ю нашай газеце заслужаны артыст БССР Уладзімір Мішчанчук казаў пра сваю сям'ю: «У нас з маёй жонкай Людмілай Кучарэнкай двое дзяцей: Андрэй і Кацярына, двое ўнукаў і двое праўнукаў, але яшчэ, як кажуць, не вечар». А цяпер яго дачка Кацярына, салістка Дзяржаўнага камернага аркестра Беларусі, першая скрыпка і мастацкі кіраўнік Мінскага струннага квартэта, педагог Рэспубліканскай гімназіі-каледжа пры Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, раскажа аб тым, што значыць тата ў яе жыцці.*

Кацярына МІШЧАНЧУК з татам.

— Тата для мяне — чалавек, які заўсёды прыйдзе на дапамогу, у любы час дня і ночы. Заўсёды падтрымае, зразумее, дасць патрэбную параду ці дапаможа справай.

Тата — гэта прафесіянал з вялікай літары, магутны, яркі, цудоўны акцёр, які валодае неверагоднай энергетыкай і харызмай. Ён — увасабленне дысцыпліны, прыклад адданасці сваёй прафесіі без астатку, прафесар, педагог Акадэміі мастацтваў. Але, як вядома, за кожным паспяховым мужчынам стаіць жанчына. Гэтая жанчына для таты — яго жонка, мая матуля — таленавітая актрыса тэатра і кіно, наймудрэйшая жанчына, педагог, прафесар Людміла Кучарэнка. Яны выхавалі некалькі пакаленняў бліскучых акцёраў тэатра, зорак кінематографа. Тата — прыклад паважлівага стаўлення да людзей, да студэнтаў і калег. Прыклад дабрыні і велікадушнасці.

Тата — мой самы ўдзячны слухач, як і мама, вядома. Ён прыходзіць на ўсе мае канцэрты ў розных калектывах і заўсёды з кветкамі, якія дорыць мне з самага дзяцінства! І, вядома, вялікім святам і шчасцем з'яўляецца ўдзел майго таты ў канцэртах калектываў, дзе я працую, як чытальніка ці вядучага — гэта заўсёды ўпрыгожванне нашых выступленняў.

Мае бацькі ўжо адзначылі залатое вяселле! Тата — любячы, клапатлівы сем'янін і выдатны дзядуля, які апякуецца ўнукам — маім сынам Ніканам, скрыпачом, пераможцам рэспубліканскага тэлеконкурсу «Талент краіны». Яны разам іграюць на адной сцэне ў спектаклі «Фальшывая нота» ў Тэатры кінаакцёра.

Я ганаруся сваім татам!

## Сяргей ЖБАНКОЎ: «Дзякуй бацьку за бязмерную любоў»

*Акцёр Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя М. Горкага Сяргей Жбанкоў вядомы шырокай публіцы і па шматлікіх ролях у кіно. А яшчэ ён заўзяты футбаліст, гуляе ў складзе акцёрскай каманды Bezgrima.*

Сяргей ЖБАНКОЎ з бацькамі і старэйшым братам.

— Мой тата Аляксандр Жбанкоў працаваў слесарам-інструментальшчыкам на Віцебскім заводзе электравымяральных прыбораў. І, прызнаюся, ён мне часта казаў: «Сярога, каб ты ведаў, як мне надакучыла гэта жалеза, як у мяне баляць рукі». Мусіць, з таго моманту, яшчэ калі я быў хлопчыкам, зразумеў, што вельмі важна любіць тое, што робіш.

Свайму тату я вельмі ўдзячны за ўсё. Асабліва за ўспаміны і яго бязмерную любоў да мяне. Я гэта заўсёды адчуваў, і ён мне не раз пра гэта казаў. Тата збіраў невялікія калекцыйныя аўтамабілі. Брат мне расказваў, што яму тата не дазваляў з імі гуляць, баючыся, што ён зламае іх. А калі нарадзіўся я, забарона сышла. Машынкі мы да гэтага часу захоўваем дома на тых жа палічках, якія калісьці зрабіў тата.

Памятаю, як на чале з татам усёй сям'ёй дапамагалі мне вырашаць задачу па матэматыцы пра плітку ў басейне, якая ніяк не давалася... Тата казаў, што ўсё ў мяне атрымаецца. Адзін з самых прыемных успамінаў звязаны з лагерам «Усход», дзе мы з братам праводзілі ўсё лета. Мы з нецярпеннем чакалі выхадных, калі прыязджалі бацькі з начлегам, прыхапіўшы палаткі. Натуральна, мы заставаліся з бацькамі, а ўначы хадзілі на ракаў. Асабліва ўдала гэта атрымлівалася ў Воўкі, майго брата.

Памятаю, як татка адвёў мяне на футбол. І гэта была любоў з першага дотыку мяча, якая не адпускае мяне да гэтага часу, за што я яму асабліва ўдзячны.

Тата памёр два гады таму. Вельмі дакладна памятаю яго погляд падчас апошняй нашай сустрэчы. Мы сям'ёй сарваліся з Мінска ў Віцебск на мой дзень нараджэння — 23 лютага. Рэдка так супадае: у мяне ў тэатры адмянілі спектакль з-за хваробы актрысы і ў жонкі быў вольны вечар. Мяне быццам магнітам пацягнула дадому.

Цяпер мне таты не хапае і я сумую па ім. Па яго ўсмешцы, па яго вачах, жартах. Але, як кажа мая дачка Ясенька: «Мне здаецца, што дзядуля Саша сядзіць на нябесных трыбунах і падбадзёрвае цябе». І ад гэтага мне робіцца вельмі светла на душы. Адчуваю, што ён са мной і хвалюецца, каб у мяне атрымалася задачка з плітками ў басейне. Дзякуй табе, татка, за ўсё. І, як ты прасіў, ногі на полі берагу.

## Вікторыя ЖБАНКОВА-СТРЫГАНКОВА: «Тата заўсёды называў мяне любімай дачушкай»

*Яркая, харызматычная салістка Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага музычнага тэатра Вікторыя Жбанкова-Стрыганкова не хавае, што яна — татава дачка.*

— Для мяне тата, Генадзь Віктаравіч Стрыганкоў, — гэта праява любові да дачкі. Калі я нарадзілася, ён цэлы тыдзень святкаваў гэтую падзею і кінуў курыць.

Па характары тата — чалавек уладны, але мяне гэта не датычылася. Калі на майго старэйшага брата ён мог павысіць голас, то на мяне — ніколі. Была сітуацыя, калі я моцна насвавольнічала ў школе. Думала, тата будзе лаяцца. Не, ён проста сур'ёзна са мной пагаварыў. І патрэбныя высновы я зрабіла.

Мае бацькі працавалі на мясакамбінаце, пазней маці занялася прадпрымальніцтвам. Артыстаў у нашай радні не было, але ўсе вельмі музычныя, і да 18 гадоў я была ўпэўнена, што людзі нараджаюцца з уменнем спяваць. Тата, дарэчы, вельмі яскрава, эмацыянальна, па-акцёрску рэагаваў на канфлікты і сітуацыі. Напэўна, калі б яго жыццё склалася па-іншаму, ён мог бы быць артыстам. Калі я сказала, што буду паступаць у Віцебскі каледж культуры, бацькі падтрымалі мой выбар, а пазней аплачвалі вучобу ў Акадэміі мастацтваў. Бацькі паважалі нашы з братам жаданні, наш выбар, у кожным з нас шанавалі асобу. Наогул, яны заўсёды імкнуліся, каб жыццё дзяцей склалася шчаслівa і паспяхова.

Вікторыя ЖБАНКОВА-СТРЫГАНКОВА з бацькамі і братам.

Тата заўсёды называў мяне любімай дачушкай. Памятаю, як ён вучыў мяне катацца на каньках. Снежная зіма, мы выходзім у двор, і вось гэта мая ўпэўненасць, што тата падстрахуе, не дазволіць упасці...

Потым тата захварэў і хутка пайшоў з жыцця. Але я рада, што ён паспеў убачыць унучку, з гонарам вёз па праспекце каляску з ёй!

Гавораць, што дзяўчаты выбіраюць мужоў, падобных да татаў. Характар майго мужа зусім не падобны на татаў, але супадае яго трапяткое стаўленне да мяне і нашай дачкі. Часам проста сэрца замірае, калі гляджу на Сярожу і Ясеньку — столькі пяшчоты, любові бачу паміж татам і дачкой.

Мне здаецца, шчаслівыя дарослыя вырастаюць з любімых дзяцей. Вось за гэта я ўдзячная сваім бацькам.

**Маргарыта ДРАЗДОВА.**
**Фота з асабістых архіваў герояў публікацыі.**

# «Для сваіх дзяцей я не алімпійскі чэмпіён, а найперш сябар і бацька»

## «Я яму сказаў: «Тваё рашэнне — наша падтрымка»

«Гісторыя, якую распавядае мой першы трэнер Віктар Браніслававіч Рамулевіч пра мой прыход у гандбол, дастаткова цікавая. Аднаго дня нейкім цудоўным чынам я апынуўся на гандбольнай трэніроўцы. Трэнер паставіў мяне ў вароты. Я быў высокі, пульхны, маларухомы хлопчык. Калі мне ў галаву прыляцеў мяч, жаданне займацца гандболам знікла. Вырашыў, што нагі маёй болей тут не будзе. Я нават хаваўся ад трэнера, каб не прыйшлося хадзіць на трэніроўкі. Але знайшоўся кампраміс паміж жаданнямі і магчымасцямі. З часам я стаў адным з найлепшых гандбалістаў у Ашмянах. І на мяне звярнулі ўвагу мінскія трэнеры. У выніку запрасілі ў спартыўны інтэрнат у Мінск. І сёння добра памятаю, як прымаў тое лёсавызначальнае рашэнне. Прыбягаю дадому з вуліцы, а мама трымае ў руках нейкі ліст і плача. Яна прачытала запрашэнне ў інтэрнат — і ў слёзы: як гэта — адпусціць свайго хлопчыка, дагледжанага, ружавашчокага? У мяне спыталі, паеду ці не. Ну а што падлетку? Я сказаў, што паеду, і пабег на вуліцу. Тата нічога не забараняў, на яго думку, дзіцяці трэба было даць магчымасць хоць бы паспрабаваць. Так хатні хлопчык у 12 гадоў паехаў пакараць сталіцу», — згадвае Андрэй Станіслававіч.

У Мацвея гісторыя падобная. У дзяцінстве быў, як жартуе яго бацька, «станоўчым рыжым анёлачкам», спортам не асабліва і цікавіўся, нягледзячы на гены. Пакуль гандбольны трэнер не запрасіў яго ў секцыю. Рашэнне Мацвей прымаў самастойна, бацькі толькі падтрымалі. Спачатку хлопец займаўся гандболам хутчэй для сябе. Выступаў за каманду Гродзенскай вобласці, ездзіў у спартыўныя лагеры, але ў спецкласе не вучыўся, аб спартыўнай кар'еры не марыў. А потым прыйшло запрашэнне ў вучылішча алімпійскага рэзерву.

«Я яму сказаў: тваё рашэнне — наша падтрымка. Захочаш застацца ў Гродне — заставайся. Захочаш паехаць у Мінск — мы цябе адвязём». Мацвей вырашыў, што хоча застацца дома. А праз год прыйшло запрашэнне не ў вучылішча, а ў СКА. Мацвей вырашыў прыняць гэта запрашэнне. І мы павезлі 14-гадовага сына ў Мінск. Год Мацвей пражыў у сталіцы самастойна, спачатку ў бабулі, затым у цёткі. Сам уставаў у 6 раніцы, праз увесь горад ехаў на трэніроўку, затым ішоў у школу і ўвечары зноў на трэніроўку. Канешне, мы перажывалі, пастаянна былі на сувязі, кожныя выхадныя прыязджалі з Гродна ў Мінск. Але ўсё ж сын вельмі рана стаў самастойным. Ён прыехаў у Мінск высокім, круглашчокім, пухленькім. Ні хуткасці, ні каардынацыі, ні навыкаў толкам не было. На адных з першых зборах трэнер сказаў камандзе прабегчы не на хуткасць, а ўсім разам. І хлопцы Мацвея цягнулі за сабой. І гэта надало яму штуршок, ён хутка дагнаў тых, хто трэніраваўся 5-7 гадоў. Сёння ён гуляе ў добрай камандзе БДУФК-СКА-РГУАР, Юрый Анатольевіч Шаўцоў прыцягваў яго на зборы з нацыянальнай зборнай. У яго ёсць перспектыва і магчымасць развівацца ў гэтым відзе спорту», — распавядае Андрэй Барбашынскі.

Цікава, а ці быў у малодшага, Захара, перад вачыма якога прыклад таты і брата, які-небудзь іншы выбар заняткаў, акрамя спорту? Але ўсё ж ад сямейнага курсу ён некалькі адышоў і знайшоў сябе ў баскетболе. Пачалося ўсё стандартна: трэнер прыйшоў у школу набіраць дзяцей у секцыю баскетбола. Потым пачаліся выступленні за каманду Гродзенскай вобласці, а затым і запрашэнне ў вучылішча алімпійскага рэзерву.

«Мацвей — спакойны, разважлівы хлопец. А на Захары ўсё гарыць: прыйшоў з трэніроўкі стомлены, крыху паляжаў і зноў на трэніроўку паляцеў. Адкуль у яго столькі энергіі, не ўяўляю», — распавядае бацька.

## «Працаваць, працаваць і... яшчэ раз працаваць»

Галоўны трэнер нацыянальнай зборнай Юрый Шаўцоў аднойчы сказаў пра Мацвея: «Калі ў яго бацькаў характар — ён усіх парве». Спартыўная кар'ера Андрэя Барбашынскага — як прыклад таго, што ў спорце часта на першае месца выходзіць менавіта характар. Адно з пацвярджэнняў — Алімпійскія гульні 1992-га. Як успамінае Андрэй Станіслававіч, ніхто і ўявіць не мог, што каманда, якая за два гады да Алімпіяды ўсім прайгравала, стане чэмпіёнам. Але скептыкі не ведалі, што кожны гулец трэніраваўся не шкадуючы сябе. На Алімпіяду прыехала каманда, у якой кожны спартсмен быў бліскуча падрыхтаваны індывідуальна, кожны горача жадаў перамагчы. Яны былі заражаны і гулялі, нібы апошні раз. Зрэшты, гэта і быў апошні раз: пасля Гульняў Аб'яднаная каманда на пляцоўцы разам не збіралася.

«Я бачу, як мяняецца каманда Мацвея. З кожным годам яны становяцца мацнейшымі. Што будзе далей — сказаць складана. Ім трэба будзе вельмі шмат працаваць. Памылкова думаць, што пасля заканчэння школы хлопец ужо прафесійны спартсмен. Да 21 года трэба вучыцца і трэніравацца, трэніравацца і вучыцца. Ну, а калі і ў 21 год нічога не атрымліваецца, трэба адпускаць спорт і знаходзіць нешта іншае. Я адкрыта кажу Мацвею і Захару, што для таго, каб дасягнуць высокіх вынікаў, ім трэба будзе працаваць, працаваць і яшчэ раз працаваць. І папярэджваю, што будуць і паражэнні, і моцныя сапернікі. Але гэтага не трэба баяцца. Трэба прымаць гэта як выклік і пераадольваць яго. А як інакш расці спартсмену?» — тлумачыць, як фарміруецца спартыўны характар, Андрэй Барбашынскі. — Калі дзеці сталі сур'ёзна займацца спортам, я ім параіў паглядзець на мой прыклад. Венгерскі «Веспрэм» хацеў падпісаць мяне на сем гадоў, каб я застаўся, трэба было прайсці поўнае абследаванне арганізма. Мне было 27 гадоў, а аналіз паказаў, што майму арганізму 72 гады. Вось вынік прафесійнага спорту. Я іх такім чынам не пужаю, а адкрыта папярэджваю, якія наступствы могуць быць. Але на гэтым зацыклівацца не варта. Таму я раю і сваім сынам, і іншым маладым спартсменам: «Пакуль маладыя, кайфуйце, атрымлівайце асалоду ад таго, што робіце. Не трэба засмучацца з-за паражэнняў: хто не падаў, той не падымаўся. Мае хлопцы гэта засвоілі».

Першыя крокі Мацвея БАРБАШЫНСКАГА на пляцоўцы.

Андрэй, Захар і Мацвей.

## «Да гульні і пасля — ён мой сын. Падчас гульні — спартсмен»

Пасля перамогі ў Барселоне Спартак Пятровіч Мірановіч сказаў сваім спартсменам: «Малайцы, канешне, але ўсё роўна вы ў гандбол гуляць не ўмееце». Зразумела, ён сказаў гэта жартам. Спартак Пятровіч заўсёды адрозніваўся своеасаблівым пачуццём гумару. Але ён сказаў гэта на камеру, і тэлегледачы жарту не зразумелі. Сярод іх быў і бацька алімпійскага чэмпіёна Андрэя Барбашынскага. «Я прыязджаю дадому, а тата ў мяне пытаецца, што я ўвогуле там рабіў, бо трэнер сказаў, што мы нічога не ўмеем. І ён усё гэта гаварыў сур'ёзна, нягледзячы на медаль. Праз 25 гадоў да юбілею Спартака Пятровіча здымалі пра яго фільм. І ён у ім сказаў, што Алімпіяду 1992 года выйгралі чатыры гульцы: Дуйшэбаеў, Барбашынскі, Якімовіч і Лаўроў. Калі я гэта пачуў, у мяне пакацілася сляза. 25 гадоў мне мой бацька нагадваў, што я там нічога не зрабіў, бо трэнер так палічыў. А бацька, паглядзеўшы гэты фільм, папрасіў прабачэння», — успамінае Андрэй Станіслававіч. І адзначае, што для яго медалі і званні яго сыноў не галоўнае: «Я спрабую данесці да Захара і Мацвея, што на спорце свет клінам не сышоўся. Нават калі не складзецца спартыўная кар'ера, не атрымаецца стаць алімпійскім чэмпіёнам — жыццё на гэтым не заканчваецца. Ты здаровы, класны хлопец, атрымлівай асалоду, упірайся, бі-ся, а як будзе заўтра, тады і будзе заўтра. Я спрабую навучыць сыноў не звяртаць увагі на тое, што пра іх нехта скажа. Вельмі важна, выходзячы на пляцоўку, не думаць пра гледачоў, журналістаў. У спартсмена падчас матча ёсць толькі ўстаноўка трэнера. І ўсё. Трэба гуляць, не баючыся і не саромеючыся. Я па сабе памятаю: калі хвалюешся, што не заб'еш, не зловіш, што скажуць людзі, нічога і не атрымліваецца».

Дзякуючы школе прафесійнага спорту Андрэй Барбашынскі глядзіць матчы сваіх дзяцей спакойна, без эмоцый і перажыванняў, уласцівых бацькам спартсменаў: «Калі я гляджу на гульню, я бачу ў першую чаргу спартсмена, які б'ецца за гонар краіны, а толькі потым сына. У мяне падыход такі: да гульні і пасля гульні ён мой сын. Падчас матча ён спартсмен і я яго адэньваю як спартсмена. Ведаючы Мацвея, разумею, што адразу пасля гульні рабіць нейкія заўвагі бессэнсоўна, бо яшчэ бушуюць эмоцыі. Але калі страсці цішэюць, ён пытаецца пра мае думкі, і я іх выказваю. Часам кажу тое, чаго ён не жадае чуць, але я лічу, што павінен гэта ведаць. Я магу нешта падказаць Мацвею, але нічога не магу зрабіць за яго. Ужываць мае парады на практыцы ці не — яго рашэнне. Калі прымае да ўвагі мае заўвагі — усё атрымліваецца. Дакладна такі ж падыход і з Захарам, але з папраўкай на тое, што баскетбол не мой від спорту».

## «Я люблю трох маці»

У 36 гадоў Андрэй Барбашынскі нечакана для ўсіх і, напэўна, нават для самога сябе вярнуўся на пляцоўку. Вядома, авантура, але адзін раз гандбаліст — заўсёды гандбаліст. Трэба было ўдыхнуць жыццё ў магілёўскі клуб «Машэка». Андрэй Барбашынскі схуднеў на 18 кілаграмаў, гуляў з хлопцамі, якія яму ў сыны падыходзілі, разам з камандай начаваў проста ў спартыўнай зале. «У Магілёве па чацвяргах у мяне былі трэніроўкі, па суботах — гульні. Пасля я вяртаўся на сваю працу. У чацвер зноў ехаў у Магілёў. На час збору браў водпуск. У такім рэжыме прайшло некалькі гадоў. Жонка паглядзела на гэта і сказала: «Ты вар'ят», — дзеліцца Андрэй Барбашынскі. Сваю жонку Ірыну ён называе прафесійнай жонкай прафесійнага спартсмена. Цяпер да гэтага статусу дабавілася і прафесійная маці двух спартсменаў. «Ірына кажа, што ў яе трое дзяцей. Я, дарэчы, самы паслухмяны», — жартуе Андрэй Станіслававіч. І адзначае, што калі ён падчас матчаў глядзіць на сыноў як на спартсменаў, то Ірына — самы заўзяты і гучны балельшчык. Што ж, мама ёсць мама.

«Ірына падтрымлівае выбар Мацвея і Захара. Яна стварае ўсе ўмовы, каб яны маглі спакойна трэніравацца. Можа быць, часам і празмерна апякуе — усё ж ужо не маленькія. Але гэта маці. Я заўсёды ім кажу: мама ў вас адна, беражыце яе. Я асабіста люблю трох маці: маці, якая мяне нарадзіла, маці, якая нарадзіла маіх дзяцей, і Радзіму-маці. Гэта любоў на ўсё жыццё. І я спадзяюся, што ў будучыні Мацвей і Захар у інтэрв'ю скажуць гэтак жа», — дзеліцца Андрэй Барбашынскі.

Паводле яго слоў, асаблівых сакрэтаў у выхаванні дзяцей няма. Самы просты і адначасова самы складаны сакрэт — асабісты прыклад. Менавіта дзякуючы яму ў маладым пакаленні закладваюцца і патрыятызм, і каштоўнасці, і разуменне, што сям'я — галоўнае ў жыцці: «Мацвей неяк сказаў, што Барбашынскім ніколі нічога не даставалася проста так. Ніколі. Для таго каб нечага дабіцца, нам трэба працаваць, працаваць і працаваць. Што мы і робім. Мы стараемся, ваюем, атрымліваем гузы, але ўсё роўна ідзём наперад. І пакуль у нас ёсць гэтае імкненне жыць, нешта рабіць, усё павінна быць добра. Да таго ж ідзём наперад адзінай камандай. Мы як бацькі падтрымліваем любыя рашэнні і ідэі сыноў, паважаем іх выбар. Для сваіх дзяцей я не алімпійскі чэмпіён, а ў першую чаргу сябар і бацька. Што б ні здарылася, радаснае ці сумнае, мы ўсё перажываем разам».

**Валерыя СЦЯЦКО.**
**Фота з асабістага архіва героя.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

# ПРОСТА СПЫТАЙ У СВАЙГО ДЗІЦЯЦІ...

## Казаць малому можна ўсё, што заўгодна, але ж яно ўбярэ ў сябе толькі тое, што бачыць

**КОЛЬКІ б правільных і разумных ідэй дарослыя ні ўкладвалі яму ў галаву, дзіця бярэ прыклад з дзеянняў, а не са слоў. Дзецям нельга хлусіць, нельга падлізвацца да іх, нельга ўказваць ім. У гэтым перакананы Яўген ГОЛУБЕЎ, мадэратар тата-школы, бацька двух сыноў (15-гадовага Артура і 8-гадовага Марата), які разам з хлопчыкамі з самага іх нараджэння. Ён кажа, што быць з дзецьмі паўсюль нескладана, і сыны — яго галоўны праект у жыцці. А як высветліць, ці добры ты тата? Проста спытай у свайго дзіцяці.**

### Белая варона ў пясочніцы

Яўген трапіў у тата-школу — праект па далучэнні мужчын да жыцця сям'і і актыўнага выхавання дзяцей — у 2008-м, калі ў яго нарадзіўся першы сын, ды так і застаўся валанцёрам, пакуль яму самому не прапанавалі стаць мадэратарам іншых груп. Ён кажа, што на свае вочы бачыў, як мянялася і мяняецца сітуацыя з татамі ў сям'і ў нашай краіне.

— На першых занятках у мяне была прапрацоўка ўласных страхаў — нарадзілася першае дзіця, нічога не разумею... Але ж з самага пачатку ведаў, што дзеці — мой прыярытэт, і я буду заўжды імі займацца. У пясочніцы я быў з першым сынам адзіным татам і выглядаў як белая варона. Матулі падазрона пазіралі на мяне і пыталіся, што здарылася з вашай жонкай. Калі я гуляў з малодшым сынам, на пляцоўцы разам са мной ужо было некалькі татаў. Тое ж было і ў паліклініцы. Калі я ўваходзіў у кабінет з сынам, педыятр пыталася «А дзе мама?». Я адказваў, што з ёй усё добра — яна займаецца сваімі справамі. Вядома, ідэальная сітуацыя, калі абодва бацькі знаходзяць час на дзяцей, але не заўжды гэта магчыма.

У дзіцячым садку Яўген цалаваў старэйшага сына перад адыходам — і ўся група глядзела на гэта як на нешта небывалае. Суразмоўца кажа, што і дагэтуль можа абодвух сыноў і абняць, і пацалаваць перад школай. І гэта не перашкаджае ім расці самадастатковымі і быць «лепшымі версіямі мяне», кажа тата.

Ён цвёрда перакананы, што спрэчак адносна дзяцей паміж мамай і татам у прысутнасці малых быць не павінна — усе несупадзенні меркаванняў вырашаюцца без дзіцячых вачэй і вушэй. З жонкай Любоўю, кажа, пашанцавала, бо супалі ўяўленні аб дзецях і іх гадаванні. «Мы ўсё ўкладаем у іх. Чым бы дзіця ні займалася, галоўнае — падтрымліваць яго ў памкненнях».

### Піца ў піжамах супраць Эміратаў

Можна старацца даць дзецям усё найлепшае, але галоўнае — увага і знаходжанне побач. Гэта агульнавядомая ісціна, але яе каштоўнасць разумееш, калі пра яе кажуць самі дзеці.

— Ёсць у нас адзін тата, які доўгі час вазіў дзяцей па свеце, паказваў ім і Эміраты, і Егіпет, і Францыю... Але потым з грашыма стала горш, і яны змаглі дазволіць сабе толькі адпачынак у вёсцы. І калі ён вырашыў патлумачыць становішча сваім тром сынам і спытаў, які ў іх самы класны ўспамін пра адпачынак, яны адказалі: «Памятаеш, неяк мамы не было дома, а мы заказалі піцу і елі яе ў піжамах?». Уяўляеце, дзеці аб'ехалі ўвесь свет, а самае класнае — есці піцу ў піжамах дома з татам.

А другі тата разам з дзецьмі актыўна бавіў час і на лыжах, і на санках, і на спортпляцоўцы, а яны яго аднойчы папрасілі проста пасядзець дома і згуляць у «Манаполію». Гэта сведчанне таго, што разам можна быць, проста знаходзячыся ў адным памяшканні, і тату не абавязкова рабіць звыш таго, што хочацца дзецям, каб ім падабалася.

### Мадэль паводзін выбраць самому

Нядаўна Яўген пачуў ад старэйшага сына: «Я толькі цяпер зразумеў, што выйграў джэк-пот з бацькамі». Да такой высновы ён прыйшоў, калі стаў больш кантактаваць з аднагодкамі і бачыць, якія адносіны могуць існаваць у іншых сем'ях. Спытаў: «А чаму мой сябар зусім нічога не робіць разам са сваім татам?».

— Я лічу, што ўсё ідзе ад бацькоў. Калі бацька маладога таты не займаўся з ім нічым, то такую мадэль паводзін ён яму і перадае, — мяркуе суразмоўца. — Задача тата-школ у прынцыпе ў гэтым і заключаецца — прадэманстраваць маладому тату мадэль паводзін. Вядома, у яго ёсць свае думкі, але на занятках ён бачыць і іншыя ўяўленні мужчын аб бацькоўстве. Адзін з заняткаў і прысвечаны абмеркаванню таго, якая мадэль узаемаадносін была ва ўдзельнікаў заняткаў са сваімі бацькамі і ці хацелі б мы перанесці яе ў сваю сям'ю. На жаль, амаль у палове выпадкаў удзельнікі кажуць «не», таму што быццам і больш-менш добра было, але ж бацька піў. І ў маіх адносінах з бацькамі было тое ж самае.

Цяперашнія маладыя людзі, якія толькі сталі бацькамі, расказваюць на занятках, што іх адносіны з бацькамі значна лепшыя, чым тыя, што былі ў татаў гадоў 20 таму. Першае, што хвалюе сучасных татаў нават тых немаўлят, якія яшчэ не нарадзіліся, — выбудоўванне адносін з уласным дзіцем. І гэта добра. З іншага боку, прыходзяць бацькі, якія просяць дапамагчы наладзіць адносіны з сынам, якому ўжо 13 гадоў. «А дзе ты быў дагэтуль?» — хочацца спытаць.

— Нядаўна на заняткі прыйшоў тата, які ўсё жыццё быў на заробках. Аднойчы ён сказаў сыну, ці не час таму рабіць урокі. А той у адказ: «Тата, едзь назад у камандзіроўку». Мужчына зразумеў, што ўсіх грошай не зарабіць, і змяніў сваё жыццё, бо ўбачыў, што страціў камунікацыю з дзецьмі. Любыя адносіны — гэта час, жаданне, укладанні — проста так нічога не адбываецца.

### Любоў і агрэсія

Празмернай любові бацькоў у адносінах да дзяцей не бывае — ім заўжды трэба больш, гэта закладзена ў бацькоўска-дзіцячых адносінах. Малыя заўжды чэрпаюць яе, хоць у пяць гадоў дзіця — ужо даволі самастойная адзінка, якая можа сама апрануцца, паесці і нават нешта прыгатаваць, упэўнены Яўген.

— Апошнія гадоў 30 чалавецтва робіць усё, каб падоўжыць дзяцінства — гадоў да 40, — смяецца ён. — Але гэта зусім не абавязкова прывядзе да інфантыльнасці. Наша з сястрой маці — повар, але мы дома не гатавалі. Калі сястра з'ехала жыць самастойна, я неяк убачыў, што яна робіць адбіўныя, і пасмяяўся: «А ты, аказваецца, умееш гатаваць». А яна адказала, што і сама пра гэта не ведала, пакуль не прыйшлося. І нічога страшнага няма ў тым, калі дзіця ў дзявятым класе яшчэ не ведае, кім хоча стаць. У любы момант у яго з'явіцца мэта, і яно будзе яе дасягаць.

Тое ж самае датычыцца і дзіцячай агрэсіі. Насілля ў свеце, нягледзячы на ўсе войны, становіцца менш, бо людзі ўжо менш цярпімыя да любых форм яго праяўлення і імкнуцца разабрацца, што адбываецца, не праходзяць міма. І нават сумесныя камп'ютарныя гульні ў сетцы робяць дзяцей менш агрэсіўнымі — яны спускаюць пару ў віртуальным свеце. І не трэба баяцца, што дзіця можа табе нечакана нагрубіць, лічыць Яўген:

— Калі малому выгаворваеш за правіннасці, магчыма, у яго будзе менавіта такая рэакцыя, аднак дзіця павінна ведаць, што яно адказвае за свой учынак. Пакаранне падоўжыцца і санкцыі павялічацца. І заўжды яно павінна выбачыцца за свае паводзіны. Бацькі таксама павінны ўмець прасіць прабачэння ў дзяцей, калі зрабілі нешта няправільна. Мы з жонкай гэта практыкуем, хоць і цяжка даецца. А дзецям выбачыцца яшчэ цяжэй. Ёсць малыя, якія ніколі не скажуць «прабач», але калі яно проста прыйдзе і сядзе побач, гэта ўжо таксама форма выбачэння.

Нават калі вы бачыце, што дзіця ў інтэрнэце шукае інфармацыю пра маньякаў, не панікуйце: гэта не азначае, што ў яго нейкія нездаровыя схільнасці. Проста такая спроба дзіцяці навучыцца баяцца. У нашым лічбавым свеце, дарэчы, знайсці павука ці жабу больш складана.

### Агульны інтарэс

З дзіцем быць паўсюль зусім няцяжка, калі ёсць жаданне. У стасунках бацькі і дзіцяці вельмі важны агульны інтарэс. Да пэўнага ўзросту малому будзе падабацца бацьку. Пасля яно знойдзе тое, што больш цікава менавіта яму, аднак час, праведзены разам за сумесным заняткам, застанецца вашым, лічыць Яўген:

— Старэйшы сын гуляе ў «Роблакс», дзе можна гандляваць. Паколькі я займаюся вэб-дызайнам, мы зрабілі некалькі рэчаў і выставілі там на продаж. І гэта было больш не дзеля заробку, а каб разам нешта стварыць.

> Дзіця трэба слухаць і вывучаць тое, што яму цікава, калі ты не разумееш яго сучасных прыхільнасцяў. Як толькі ты перастанеш яго слухаць, малы перастане табе расказваць пра сябе, сведчыць тата двух сыноў.

— А яшчэ ў нашай сям'і ёсць правіла: калі нехта кагосьці кліча, трэба адразу падысці або сказаць, што ты нечым заняты і хутка будзеш. І гэта правіла працуе ў абодва бакі.

Некалькі месяцаў Яўген разам са старэйшым сынам хадзіў займацца на турнікі, бо ў Артура была мэта — падкачацца. Разам яны яе дасягнулі, пры гэтым займаючыся штодня адной справай. Летам яшчэ і малодшага бралі з сабой, так што атрымалася агульная мужчынская справа.

### Прымусіць быць бацькам немагчыма

У жыцці сучаснага мужчыны шмат «птушачак»: уласная справа, адпачынак у Дубаі, крутая машына... Але ж у яго няма, у адрозненне ад жанчын, «птушачкі» стварыць сям'ю.

— Праблема нават не ў тым, што яе няма, а ў тым, што яна не залічваецца. У сучасным грамадстве пабудаваць добрую сям'ю для большасці мужчын не дасягненне, — разважае Яўген Голубеў. — Мужчына не лічыць сям'ю рэсурсам, і гэта праблема выхавання: хлопчыку кажуць, што ён будзе класным лётчыкам ці касманаўтам, але ніхто не кажа, што ён стане класным сем'янінам. Толькі з часам мужчыны пачынаюць разумець каштоўнасць сям'і, і асабліва выразна яны разумець, што сям'я была каштоўным рэсурсам, толькі пасля разводу.

> **«У пясочніцы я быў з першым сынам адзіным татам і выглядаў як белая варона. Матулі падазрона пазіралі на мяне і пыталіся, што здарылася з вашай жонкай».**

Добры бацька — цалкам сацыяльнае паняцце, якое ідзе ў разрэз з біялогіяй. Грамадства намагаецца прывязаць мужчыну да сям'і, стварыць яму добрыя ўмовы, але ж біялогія кажа, што для самца пераваг у сям'і няма. Ужо прайшлі часы, калі мужчыну трэба было ганяцца за антылопай для абеду — яна сама вывальваецца са скрыні з дастаўкай на дом, але ж самец працягвае некуды бегчы. Аднак статыстыка сведчыць, што жанатыя жывуць на дзесяць гадоў даўжэй, узровень стрэсу ў іх жыцці ніжэйшы.

— Прымусіць чалавека быць добрым бацькам немагчыма. Калі ён кажа «я выбраў сям'ю», асабліва калі дзеля гэтага давялося адмовіцца ад сваёй мары ці справы жыцця, то шчасця не будзе ні яму, ні сям'і. Добра, калі людзі, якія не хочуць стварыць сям'ю, не забіваюць сабе гэтым галаву і не імкнуцца зрабіць гэта проста для таго, каб быць такімі, як усе.

Яўген лічыць, што сёння мужчынскі погляд на ролю бацькі ў сям'і пачынае мяняцца, і гэтаму шмат дапамагае сама сям'я (жонка і дзеці). Паступова, але зацвярджаецца глабальны трэнд, што бацькам быць крута.

**Ірына СІДАРОК.**
**Фота дадзена героем артыкула.**

# Гірлянда з лісцікаў, штучны снег і фокус з паветраным шарыкам

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

Ёсць іншы, больш хуткі, спосаб стабілізацыі прыродных матэрыялаў. Наліваем у невялікую каструльку ваду і гліцэрын, кладзём туды лісце і варым на маленькім агні каля гадзіны. Калі лісцікі зварацца і стануць бліскучымі і гнуткімі, раствор можна зліць у слоік і выкарыстоўваць для наступных партый нарыхтовак. Пасля таго як лісцікі высахнуць (спатрэбіцца каля тыдня), можна прыступаць да творчасці. З іх робім восеньскія гірлянды, падсвечнікі, карціны (пасля кансервацыі ў гліцэрыне лісцікі не крышацца і не рассыпаюцца, таму з іх можна выразаць розныя дэталі). У такім стабілізаваным выглядзе яны захоўваюцца каля года. Асабліва цудоўна кансервуецца такім спосабам шчыльнае лісце дуба, вяза, «носікі» клёна. Акрамя лісцікаў, можна стабілізаваць імхі, лішайнікі, часткі раслін, кветкі.

## Рогі, ногі, хвост...

Восенню бацькі з дзеткамі ходзяць па парках і збіраюць каштаны, шышкі, жалуды, галінкі. У нас дома таксама стаіць цэлы пакет гэтага багацця. Надзея Аксёненка параіла зрабіць з яго разам з дзіцем вельмі мілага аленя: для тулава і шыі спатрэбяцца доўгія яловыя шышкі, для галавы — жалуд, для рагоў, ног, і хвосціка падбярыце падыходзячыя галінкі. Можна ўсе дэталі склеіць карычневым пластылінам, але больш эстэтычна будзе злучыць іх пры дапамозе клеявога пісталета. Алень атрымліваецца вельмі прыгожы і стыльны, таму яго смела можна размясціць на паліцы альбо павесіць на навагоднюю ёлку. З прыродных матэрыялаў можна зрабіць і іншых жывёл, а потым усёй сям'ёй паставіць сапраўдны лясны спектакль. У якасці гледачоў паклікаць суседзяў, бабуль і дзядуль.

**Так мы на ўласным вопыце адчулі, як бывае, калі засмоктвае балота ці зыбучыя пяскі. Карацей, уражанняў і новых адчуванняў мора.**

Мой сын апошнім часам марыць пра карону. Надзея, даведаўшыся, што ён аматар розных палак і палачак (у яго іх цэлая калекцыя), параіла мне зрабіць яе з галінак. Для гэтага проста трэба выразаць палоску з кардону. На яе наклеіць двухбаковы скотч, да якога прымацаваць галінкі. Каб яны лепш трымаліся, зверху я зафіксавала іх яшчэ адной палоскай двухбаковага скотча, якую аздобіла каляровым кардонам. Да скотча, акрамя галінак, можна прымацаваць мох, яркія лісцікі (для гэтага цудоўна падыдуць менавіта закансерваваныя ў гліцэрыне, так карона будзе даўгавечнай, бо свежыя лісцікі скруцяцца, а

лежыць ад таго, з якой хуткасцю мы на яе ўздзейнічаем.

Зрабіць яе прасцей простага. Спатрэбіцца толькі бульбяны крухмал і вада. Мы для таго, каб гуляць у місцы, бралі 1 шклянку крухмалу і паўшклянкі вады (суадносіны 2:1). Усё трэба добра перамяшаць рукамі. Калі неньютанаўская вадкасць атрымаецца занадта вадзяністая, дадайце яшчэ крухмалу, і, наадварот, калі занадта густой — крыху вады.

засушаныя — занадта крохкія), жалуды і шапачкі ад іх. З прыродных матэрыялаў можна рабіць не толькі кароны, але і бранзалеты, амулеты ды іншыя ўпрыгожванні, стыльныя вянкі на дзверы. Не стрымлівайце фантазію.

**Не ведаю, як вашы дзеці, а мой сын ужо не можа дачакацца зімы. І я вырашыла парадаваць яго і зрабіць штучны снег.**

А яшчэ сабраныя жалуды і каштаны Надзея раіць замарозіць, а потым на пачатку вясны дастаць з маразілкі і пасадзіць у мокрую зямлю. Праверана: такое насенне прарастае практычна на 100 працэнтаў. А потым год за годам разам з дзецьмі назіраць, як маленькі расток ператвараецца ў сапраўднае дрэва.

## Цуды з... крухмалу

Упершыню я зрабіла для сына і яго сяброў неньютанаўскую вадкасць год таму. Дзеці былі ў захапленні. Ды што хаваць, нават мне было вельмі цікава вывучаць яе чароўныя ўласцівасці. Неньютанаўская вадкасць — гэта такая вадкасць, якая можа быць як цвёрдай, так і вадкай. Усё залежыць ад таго, з якой хуткасцю мы на яе ўздзейнічаем.

Як гуляць з неньютанаўскай вадкасцю? Спачатку мы проста вывучалі яе навобмацак. Калі вадкасць мясіць у руках, ляпіць з яе шарыкі, то яна зацвердзявае, становіцца падобнай да пластыліну. Але як толькі спынішся, расслабіш далонь — усе камочкі літаральна выцякаюць скрозь пальцы. Гэта ўжо і так незвычайная з'ява, з якой можна важдацца цэлую гадзіну.

Можна паспрабаваць пераліваць неньютанаўскую вадкасць. Калі павольна нахіляць міску, то яна сцякае ўніз, як не надта густая смятана. Калі ж ёмістасць з неньютанаўскай вадкасцю рэзка перавярнуць, то яна не выцякае зусім. Ведаючы гэты нюанс, можна смела клікаць у госці, напрыклад, бабулю і паказваць ёй фокус са словамі: «А хочаш, я зараз вылью сабе на галаву гэтую вадкасць?»

Неньютанаўская вадкасць у адрозненне ад той жа вады не пырскаецца. Калі ўзяць тэнісны мячык і кінуць у міску — ён проста ўліпне ў яе, і ніякага чаканага ўсплёску не будзе. Дарэчы, любыя кропелькі, якія накапалі з міскі, прыбраць вельмі лёгка. Іх проста збіраеш у камячок і кідаеш назад у міску, дзе яны тут жа ператвараюцца зноў у вадкасць.

Акрамя таго, можна назіраць разам з дзеткамі, як у неньютанаўскай вадкасці грязнуць, як у балоце, невялічкія пластыкавыя цацкі. Калі імі рэзка «тупаць» па паверхні, то яны лёгка «перабягаюць» міску, як па-сухому. Але калі запаволяцца на адным месцы, то тут жа пачынаюць тануць. І за некалькі секундаў цалкам паглыбляюцца ў «багну», з якой іх потым складана выцягнуць. Так мы на ўласным вопыце адчулі, як бывае, калі засмоктваюць балота ці зыбучыя пяскі. Карацей, уражанняў і новых адчуванняў мора. Іх немагчыма перадаць ні фотаздымкамі, ні словамі. Проста развядзіце крухмал з вадой і... усё зразумееце самі. Тым больш што гэта не патрабуе ні фінансавых выдаткаў, ні асаблівай падрыхтоўкі, ні нейкай суперпрыборкі пасля гульні.

**А яшчэ сабраныя жалуды і каштаны Надзея раіць замарозіць, а потым на пачатку вясны дастаць з маразілкі і пасадзіць у мокрую зямлю.**

Дарэчы, неньютонаўская вадкасць з часам цалкам зацвердзявае, таму пасля таго, як пагуляліся, яе нельга выліваць у ракавіну. Лепш змясціць у цэлафанавы пакет і выкінуць у сметніцу альбо ў кампоставую яму, калі вы жывяце ў вёсцы.

## Зіма ў тазіку

Не ведаю, як вашы дзеці, а мой сын ужо не можа дачакацца зімы. І я вырашыла парадаваць яго і зрабіць штучны снег. Для гэтага трэба змяшаць у невялікім тазіку 500 грамаў крухмалу са 100-150 грамамі дзіцячага касметычнага масла (можна ўзяць і раслінны алей). У працэсе змешвання алей дадавайце не адразу ўвесь, а порцыямі. Можа спатрэбіцца крыху менш ці крыху больш указанага аб'ёму. Правяраць трэба навобмацак: «снег» павінен быць сухі і рассыпчаты, але пры гэтым добра ляпіцца. Ён прыемны навобмацак, нават рыпіць зусім як сапраўдны сняжок і цалкам бясшкодны для скуры. Дарэчы, корпацца ў ім ды ляпіць снегавікоў цікава будзе не толькі малечы, але і школьнікам.

**Можна ўсе дэталі склеіць карычневым пластылінам, але больш эстэтычна будзе злучыць іх пры дапамозе клеявога пісталета.**

Раю на гэтым не спыняцца. У інтэрнэце цяпер можна знайсці вялікае мноства ідэй для розных майстар-класаў ды навуковых эксперыментаў. Напрыклад, мы ўсёй сям'ёй нядаўна надзімалі паветраны шарык пры дапамозе звычайных харчовых соды і воцату. Для гэтага спачатку насыпалі ў паветраны шарык дзве чайныя лыжкі соды, затым налілі ў пластыкавую бутэльку пры дапамозе лейкі чатыры сталовыя лыжкі воцату. Як толькі нацягнулі шарык на гарлавіну бутэлькі і сода высыпалася ў воцат — шарык пачаў паступова надзімацца. Сакрэт гэтага фокуса ў тым, што пры змешванні соды і воцату выдзяляецца вуглякіслы газ, які і напаўняе паветраны шарык. Таму, як бачыце, усё арыгінальнае проста. І вельмі цікава.

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**

Дапамога

# МЫ ПОБАЧ!

## Як навучыцца атрымліваць задавальненне ад жыцця

**...16-гадовая Кацярына (імя змянена) скардзілася на трывожнасць, беспадстаўныя істэрыкі і слёзы без прычыны. Яна не прымала сябе, свайго цела. Адчувала часты галаўны боль і перажывала, што, калі хлопец кіне яе, яна не зможа жыць. З такімі праблемамі дзяўчына звярнулася да псіхолага ў цэнтр, сяброўскі да падлеткаў, дзе ёй дапамаглі. За 20 гадоў у Беларусі створана ўжо 58 цэнтраў, якія за апошняе дзесяцігодзе дапамаглі выратавацца 500 тысячам падлеткаў.**

Падлеткавы ўзрост рэдка бывае лёгкі, і гэта правіла працуе ў абодва бакі. У дзяцей пачынаецца гарманальная перабудова арганізма, якая выклікае моцны эмацыянальны скачок. Падлеткі адчуваюць, што не належаць сабе і не разумеюць, чаму ім так дрэнна. Дарослыя ў гэты час таксама пакутуюць, бо дзеці аддаляюцца ад іх і часта «б'юць» па самых балючых месцах, кажуць спецыялісты.

Цэнтры, сяброўскія да падлеткаў, — месцы, куды падлеткі могуць звярнуцца па дапамогу па хвалюючых пытаннях бясплатна і ананімна. Могуць атрымаць кансультацыю псіхолага, акушэра-гінеколага, нарколага, валеолага і педыятра, прайсці тэст на ВІЧ. Сістэму такой дапамогі падлеткам аказвае Міністэрства аховы здароўя пры падтрымцы ЮНІСЕФ у Беларусі. Дзякуючы іх сумесным намаганням у цэнтрах створана бяспечная і даверлівая атмасфера для хлопцаў і дзяўчат.

...Мама Кацярыны хвалявалася, назіраючы за зменамі паводзін дзяўчыны, аднак пераконвала сябе, што з дачкой усё нармальна і тая проста лянуецца. Пасля дыягностыкі ў псіхолага высветлілася, што ў Каці клінічна выражаная дэпрэсія і высокая трывожнасць. Яе накіравалі да псіхіятра, які выпісаў лекі і прызначыў карэкцыйныя заняткі з псіхолагам. Маці плакала, бо не падазравала, што ўсё настолькі сур'ёзна.

Каця раз на тыдзень хадзіла ў цэнтр на заняткі цягам трох месяцаў. За гэты час яна змагла прыняць сябе, навучылася спраўляцца з трывогай. Маме дзяўчыны далі рэкамендацыі, як наладзіць стасункі з дачкой. А сама Каця на апошняй сустрэчы са спецыялістамі сказала: «Я навучылася атрымліваць задавальненне ад жыцця і жыць тут і цяпер, а не страхам будучага і памылкамі мінулага».

— У бацькоў і псіхолагаў розныя задачы, і яны не ўзаемазамяняльныя, — кажуць псіхолагі і раяць звяртацца па кансультацыю ці рэкамендаваць цэнтры сваім дзецям. — Зварот да псіхолага не абясцэньвае бацькоў, не сведчыць пра тое, што яны не спраўляюцца са сваімі задачамі. Любіць, клапаціцца, выхоўваць, падтрымліваць, разам бавіць час, гуляць — задача бацькоў. Псіхолаг жа дапамагае пераадольваць цяжкія жыццёвыя сітуацыі, спраўляцца з крызіснымі перыядамі самастойна ці з удзелам спецыяліста.

*Знайсці адрасы і тэлефоны цэнтраў можна па спасылцы https://junior.medcenter.by/.*

**Ірына СІДАРОК.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие
«Минский областной центр инвестиций и приватизации»
(организатор аукциона)
по поручению **открытого акционерного общества «Слуцк-Модуль» (продавец)**
в процедуре ликвидации юридического лица
проводит открытый аукцион

## ПО ПРОДАЖЕ ОДНИМ ЛОТОМ ЗДАНИЯ СКЛАДА

**с инв. № 640/С-38242 общей площадью 2467,1 кв. м и площадью асфальтобетонной (инв. № 98364) с инв. № 640/С-84443 общей площадью 1 612,5 кв. м, расположенных на земельном участке с кадастровым номером 624650100001009966**
*(право аренды по 10.12.2040)*
**площадью 0,7325 га по адресу: Минская область, г. Слуцк, ул. 14 Партизан, 101/18.**

Начальная цена с НДС (20 %) **– 578 880,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **57 888,00** бел. руб.

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, код платежа – 40901, код категории платежа OTHR, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Шаг аукциона – 5 процентов.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах регламентирован Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16, размещенным на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) календарных дней после подписания договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (единственный участник, согласившийся приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) (покупатель).

Аукцион состоится **04.12.2023** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **30.11.2023** до **17.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, 136-31-11.**
**Тел. для осмотра: 8 (029) 687 59 23, 8 (044) 717 02 56.**

УНН 600078282

**РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал) информирует о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего Открытому акционерному обществу «Лидский завод электроизделий».**

**Аукцион состоится 14.11.2023 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209. Телефон для справок 55-87-71**

| | |
|---|---|
| Лот № 1 | |
| Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона | ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 420/С-3357 (назначение – здание нежилое, наименование – охотничий домик), общей площадью 58,0 кв. м, расположенное по адресу: Лидский р-н, Дворицанский с/с, южнее дер. Юровичи. Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый номер 423683000044000001, площадью 0,0613 га (назначение – для обслуживания охотничьего домика) по адресу: Лидский р-н, Дворицанский с/с, южнее дер. Юровичи. Условия проведения аукциона – возмещение победителем аукциона затрат Продавца по уплате вознаграждения Организатору торгов в размере 5 % от конечной цены продажи объекта. Условия оплаты – по договоренности сторон |
| Начальная цена продажи | 7 830 руб. (семь тысяч восемьсот тридцать рублей) с учетом НДС |
| Сумма задатка | 391,50 руб. (триста девяносто один рубль пятьдесят копеек) |
| Реквизиты для перечисления задатка | BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |
| Место, дата и время окончания приема заявлений | Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник–четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед – с 12.30 до 13.18. Последний день приема заявлений – 10.11.2023 г. до 15.00 |
| Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 16.03.2021 г. | |
| Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – https://grino.by/auktsiony | |

# ЗАО «Белреализация» объявляет аукцион

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, BELTORGI.BY.

Продавец: **УП «Комбинат декоративно-прикладного искусства им. А.М. Кищенко»** (УНП 600126458) 222520, г. Борисов, ул. Блюхера, 19, тел. 8 033 688 86 54, в лице ликвидатора ООО «Правовая компания «Делегат».

Повторные публичные торги в электронной форме будут проведены: **21 ноября 2023 г. 11.00-16.00** на электронной торговой площадке BELTORGI.BY.

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС |
|---|---|---|
| 1 | Гараж, инв. № 1-005, общ. пл. 114 кв. м. Механические мастерские и склады, инв. № 01-008, общ. пл. 337 кв. м. Производственный корпус керамического цеха, инв. № 01-010, общ. пл. 4027,0 кв. м. Производственный корпус № 01-003, столовая комбината, инв. № 01-03а, общ. пл. 3000,1 кв. м. Проходная, инв. № 01-006 (задняя). Проходная центральная, инв. № 01-013, общ. пл. 13 кв. м. Склад, инв. № 01-009. Склад материальных ценностей, инв. № 01-017, общ. пл. 184 кв. м. Склад материальных ценностей, инв. № 01-012, общ. пл. 103,7 кв. м. Художественные мастерские, инв. № 01-002, общ. пл. 996 кв. м, г. Борисов, ул. Блюхера, 19 | 977 671,07 |
| 2 | Кабина распылительная, инв. № 328-2 | 100,00 |
| 3 | Кабина распылительная, инв. № 328 | 100,00 |
| 4 | Швейная машина ТИП 333Д (GLOBAL), инв. № 456 | 130,00 |
| 5 | Станок точильно-модельный, инв. № 369 | 120,00 |
| 6 | Станок точильно-модельный, инв. № 368 | 120,00 |
| 7 | Шкаф сушильный № 5, инв. № 288 | 60,00 |

Телефон для ознакомления и осмотра +37529-698-53-53.

**Для участия в торгах необходимо в срок с 03.11.2023 г. 09.00 по 20.11.2023 г. 16.00:** 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «Сбер Банк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену за лот. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 календарных дней со дня проведения торгов оплатить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, и аукционный сбор. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 10 рабочих дней со дня проведения торгов. Срок оплаты предмета торгов: п. 1 – не позднее 10 рабочих дней со дня проведения торгов, а также возможна рассрочка на условиях договора купли-продажи, пп. 2–7 – не позднее 10 рабочих дней со дня проведения торгов. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» от 16.09.2023 г.

# ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона)
по поручению ОАО «Слуцкий Агросервис»
(продавец) проводит открытый аукцион по продаже

## недвижимого имущества:

**Лот 1: здание цеха по ремонту полнокомплексной техники с инв. № 640/С-26744 общей площадью 2 159,7 кв. м, адрес: Минская обл., Слуцкий р-н, Весейский с/с, 9/2, восточнее аг. Весея.**

**Начальная цена** с НДС (20 %) **– 800 000,00** бел. руб. Задаток 10 % от начальной цены – **80 000,00** бел. руб.

**Лот 2: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ с инв. № 640/С-26853 общей площадью 97,5 кв. м, адрес: Минская обл., Слуцкий р-н, Весейский с/с, 9/3, восточнее аг. Весея.**

**Начальная цена** с НДС (20 %) **– 29 250,00** бел. руб. Задаток 10 % от начальной цены – **2 925,00** бел. руб.

**Лот 3: диспетчерский пункт с инв. № 640/С-115416 общей площадью 163,5 кв. м, адрес: Минская обл., Слуцкий р-н, Весейский с/с, 9/20, восточнее аг. Весея.**

**Начальная цена** с НДС (20 %) **– 48 840,00** бел. руб. Задаток 10 % от начальной цены – **4 884,00** бел. руб.

**Лоты №№ 1–3 расположены на земельном участке с кадастровым номером 624681302601000705 площадью 9,0631 га (право постоянного пользования), для обслуживания будет выделена доля в праве на земельный участок.**

**Лот 4: подъездной путь 500 м с инв. № 640/С-115436 общей протяженностью 627,4 м, адрес: Минская обл., Слуцкий р-н, 63, железнодорожный путь, расположенный на земельном участке с кадастровым номером 624650100001006033 площадью 18,1201 га (право аренды), для обслуживания будет выделена доля в праве на земельный участок.**

**Начальная цена** с НДС (20 %) **– 101 520,00** бел. руб. Задаток 10 % от начальной цены – **10 152,00** бел. руб.

Лот № 1 обременен договором аренды по 24.10.2025, лот № 3 – по 01.05.2026.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, код платежа – 40901, код категории платежа OTHR, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объектов производится в течение 20 (двадцати) календарных после проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов в следующих размерах: по лоту № 1 – 2 (двух) процентов, по лоту № 2 – 7 (семи) процентов, по лоту № 3 – 5(пяти) процентов, по лоту № 4 – 4 (четырех) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона и возмещает продавцу затраты на публикацию извещения о проведении аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Аукцион состоится **04.12.2023** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **01.12.2023** до **16.00 в каб. 320** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, 136-31-11. Тел. для осмотра: (8044) 545-37-36.**

УНП 600043896

# ДОПОЛНЕНИЕ К ПРОЕКТНОЙ ДЕКЛАРАЦИИ

государственного предприятия
«Управление капитального строительства Запад»

**по жилому дому № 3 (по генплану) в составе объекта «Многоквартирные жилые дома со встроенными помещениями торгово-административного назначения и подземными гараж-стоянками в границах пр-та Дзержинского, ул. Щорса (№ 3, № 4 по генплану)», опубликованной в газете «Звязда» 14.10.2023**

**Сведения о застройщике**

**Застройщик:** коммунальное унитарное дочернее предприятие «Управление капитального строительства Запад» зарегистрировано Мингорисполкомом в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей 05.01.2015 за № 192400611.

**Юридический адрес и местонахождение предприятия:** 220025, г. Минск, ул. С. Есенина, 4-107, тел./факс (017) 234-16-99.

**Офис продаж:** 220025, г. Минск, ул. С. Есенина, 6, офис 213, тел.: (017) 234 16 98, (044) 795 44 44, (044) 559 33 91.

**Режим работы офиса продаж:** понедельник – четверг с 8.30 до 17.30, пятница – с 8.30 до 16.15, обеденный перерыв – с 13.00 до 13.45.

Гражданам, не состоящим на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, индивидуальным предпринимателям и юридическим лицам для заключения договоров создания объектов долевого строительства предлагаются:

5 двухкомнатных квартир, в том числе:
- № 136 на 18-м этаже общей площадью 68,9 кв. м;
- № 139 на 19-м этаже общей площадью 67,8 кв. м;
- № 150 на 22-м этаже общей площадью 68,9 кв. м;
- № 151 на 22-м этаже общей площадью 67,8 кв. м;
- № 152 на 22-м этаже общей площадью 68,9 кв. м.

Стоимость строительства 1 квадратного метра общей площади квартиры 4150 белорусских рублей.

**Условия оплаты** – 100 % от стоимости договора в течение 15 (пятнадцати) календарных дней с даты регистрации договора в местном исполнительном и распорядительном органе.

Документы для заключения договоров создания объектов долевого строительства будут приниматься и регистрироваться в ходе личного приема и в порядке живой очереди с 8.30 08.11.2023 года по адресу: г. Минск, ул. С. Есенина, д. 6, офис 213 (офис продаж).

**Для подачи заявления и заключения договора необходимо наличие:**

для физических лиц – паспорта (биометрического документа, удостоверяющего личность); доверенности, оформленной в установленном законодательством порядке;

для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей: документа, подтверждающего полномочия представителя, паспорта (биометрического документа, удостоверяющего личность) представителя, копии свидетельства о государственной регистрации и Устава.

Если гражданин либо иной претендент на участие в долевом строительстве в течение 5 (пяти) календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и письменно не сообщил об уважительных причинах своей неявки, его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу и застройщик оставляет за собой право заключить договор на заявленный объект долевого строительства с другим претендентом.

Срок действия настоящей проектной декларации – до момента опубликования новой проектной декларации.

Подробные сведения об объекте долевого строительства, о планировках квартир и ходе строительства можно получить в офисе продаж по адресу: **220025, г. Минск, ул. С. Есенина, д. 6, офис 213, тел.: (017) 234-16-98, (044) 795-44-44, (044) 559 33 91.**

## Извещение об открытом аукционе по продаже не завершенного строительством жилого дома и земельного участка в г. Гродно 5 декабря 2023 года

| № лота | Местонахождение земельного участка, его кадастровый номер | Площадь земельного участка (га) | Характеристика (описание) не завершенного строительством капитального строения | Ориентировочные расходы по подготовке документации для проведения аукциона, руб. | Начальная цена предмета аукциона (в том числе: начальная цена не завершенного строительством капитального строения; земельного участка), руб. | Сумма задатка, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Гродненская область, г. Гродно, ул. Белая, 8 (У-152, микрорайон «Заболоть») 440100000002007949 | 0,1009 | Незавершенное незаконсервированное капитальное строение, степень готовности 12 %, площадь застройки: 95 кв. м. Фундамент: фундаментные блоки, железобетон | 355,14 | 35 514,47 (7 161,57; 28 352,90) | 7 100 |

Земельный участок предоставляется в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Инженерные коммуникации на участке отсутствуют. Возможность подключения к внеплощадочным сетям водоснабжения, газоснабжения, электроснабжения и пр., и точки подключения определяются проектом. Земельный участок может иметь ограничения и обременения. Назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме). Условия, предусмотренные в решении о формировании земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона: внесение платы за предмет аукциона; возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и представлением участникам документации, необходимой для его проведения; обращение за государственной регистрацией прав на земельный участок в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся; продолжить строительство жилого дома в установленный срок.

Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», телефоны: + 375 (152) 626055, 626056.

Для участия в аукционе необходимо: внести задаток в указанном размере, перечисляемый на расчетный счет BY24 AKBB 3012 0000 4181 0400 0000 ГОУ № 400 ОАО АСБ «Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY2X, код назначения платежа 40901, УНП 590727594 получатель – коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости»; представить в ГП «Гродненский центр недвижимости» следующие документы: заявление на участие в аукционе установленной формы; документ, подтверждающий внесение суммы задатка; подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, включающее обязательство по уплате в соответствии с законодательством штрафных санкций и иные требования; дополнительно представляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность; представителем или уполномоченным должностным лицом негосударственного юридического лица РБ – доверенность, выданная юрлицом; документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица, без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица. При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

**Аукцион состоится 5 декабря 2023 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1 (актовый зал).**

**Прием документов осуществляется по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет № 117 с 3 ноября по 29 ноября 2023 года включительно в рабочие дни с 08.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00.**

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи, не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 г. № 220. Аукцион проводится аукционистом при наличии двух или более участников аукциона. Аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер не поднимет только один участник аукциона. Аукционист называет аукционный номер этого участника, трижды последнюю цену и объявляет о продаже предмета аукциона, а участника аукциона – победителем аукциона в отношении соответствующего предмета аукциона. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником либо для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов. Победитель торгов либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на приобретение земельного участка как единственный, подавший заявление на участие в аукционе, в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся обязан: внести плату за земельный участок; возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и представлением участникам документации, необходимой для его проведения; выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона. После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Гродненский горисполком выдает победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона выписку из решения об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома, один экземпляр протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся. Оплата стоимости предметов аукциона осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли. Осмотр земельного участка на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

## Извещение о проведении открытого аукциона

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5, корп. 2, пом. 1703, УНП 191224638 |
| **Продавец** | ОАСО «Би энд Би иншуренс Ко», г. Минск, ул. Я. Коласа, 38, УНП 101063229. Тел. + 375 29 688-04-88 |

**Предмет аукциона**

Местоположение лотов №№ 1–3 **– Минская обл., Минский р-н, Щомыслицкий с/с, направление ТЭЦ-4, 3-й пер. Монтажников, 3**

**Лот № 1**

**Изолированные помещения: № 1** (производственное помещение, 600/D-91728) 206,3 кв. м, **№ 2** (административное помещение, 600/D-91729) 221,7 кв. м, **№ 3** (производственное помещение, 600/D-91730) 288,4 кв. м, **складское помещение** (600/D-40243) 205,2 кв. м

**Начальная цена лота № 1 (с НДС 20 %) – 1 486 800,00 бел. руб.**
Шаг аукциона – 74 340,00 бел. руб.

**Лот № 2**

**Административное помещение** (3-й этаж, 600/D-40239) 233,6 кв. м

**Начальная цена лота № 2 (с НДС 20 %) – 480 000,00 бел. руб.**
Шаг аукциона – 24 000,00 бел. руб.

**Лот № 3**

**Административное помещение** (5-й этаж, 600/D-40241) 83,9 кв. м

**Начальная цена лота № 3 (с НДС 20 %) – 165 600,00 бел. руб.**
Шаг аукциона – 8 280,00 бел. руб.

**Лот № 4**

**Административно-торговое помещение** (500/D-7023833) 733,5 кв. м.
Адрес: **г. Минск, ул. Замковая, д. 33-6**

**Начальная цена лота № 4 (с НДС 20 %) – 2 241 600,00 бел. руб.**
Шаг аукциона – 112 080,00 бел. руб.

**Лот № 5**

**Кабинеты 87,9 кв. м с открытой автостоянкой пл. 523 кв. м** (500/D-708041778).
Адрес: **г. Минск, ул. Замковая, д. 33-1а**

**Начальная цена лота № 5 (с НДС 20 %) – 356 400,00 бел. руб.**
Шаг аукциона – 17 820,00 бел. руб.

**Лот № 6**

**Стулья, кресла** в составе 33 единиц. Перечень см. на сайте организатора аукциона ipmtorgi.by

**Начальная цена лота № 5 (с НДС 20 %) – 3 097,20 бел. руб.**
Шаг аукциона – 154,86 бел. руб.

**Лот № 7**

**Офисная мебель и оргтехника** в составе 404 единиц. Перечень см. на сайте ipmtorgi.by

**Начальная цена лота № 5 (с НДС 20 %) – 184 483,20 бел. руб.**
Шаг аукциона – 9 224,16 бел. руб.

Обременение: площади помещений (лоты №№ 1–3) частично сданы в аренду (с информацией можно ознакомиться на сайте ipmtorgi.by)

**Порядок ознакомления:** в рабочие дня по предварительному согласованию. +375 (29) 680-80-99 (Шубко Юлия Владимировна)

**Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов:** аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидир. юридич. лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совмина РБ от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированные в журнале регистрации заявлений на участие в торгах и заключившие с организатором торгов договор о задатке. С подробной информацией можно ознакомиться на сайте организатора аукциона **ipmtorgi.by**

В случае регистрации на аукцион одного участника предмет аукциона может быть продан данному участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %

**Задаток – 5 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; УНП 191224638; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней** после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета аукциона:** предмет аукциона должен быть оплачен покупателем в течение **20 (двадцати) рабочих дней** со дня проведения аукциона

Победитель аукциона либо единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на организацию и проведение аукциона, а также оплатить организатору аукциона вознаграждение от 2 до 10 % от цены продажи в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения аукциона

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

**Дата и время начала аукциона**

По лотам №№ 1–5: **13.11.2023 в 13.00**; по лотам №№ 6–7: **04.12.2023 в 13.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, оф. 5

**Прием заявок**

По лотам №№ 1–5: **11.11.2023 до 17.00;** по лотам №№ 6–7: **01.12.2023 до 17.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, оф. 5

**Контакты: +375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06, auction@ipmconsult.by**

## ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие «МГЦН»
**21 ноября 2023 года** проводит **363-й открытый аукцион по продаже права заключения договоров аренды** капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности (далее – имущество)

| № предмета аукциона | Арендодатель имущества | Местонахождение имущества | Площадь (кв. м) | Размер коэффициента к базовой ставке арендной платы или размер арендной платы (руб.) | Начальная цена права заключения договора аренды имущества/ сумма задатка (руб.) | Наименование и целевое использование имущества |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 95 | **Учреждение «Белорусский государственный музей истории Великой Отечественной войны», тел.: +37517 278-96-70, +37517 276-03-98** | г. Минск, пр-т Победителей, 8-1 | 330,8 | 3,0 | 1 397,63 | Встроенное помещение под объект общественного питания (кафе). **Срок аренды – 3 года** |
| 96 | **Белорусский государственный университет, тел. +37517 209-55-22** | г. Минск, ул. Бобруйская, 5 | 2,25 | 3,0 | 14,26 | Часть аудитории под размещение кофейного аппарата. **Срок аренды – 3 года** |
| 97 | **РУП «Минскавтодор-Центр», тел. +37517 259-85-95** | г. Минск, ул. Кижеватова, 8, пом. 47 | 48,04 | 779,40 руб. | 202,97 | Изолированное помещение под офисное помещение с деятельностью по коду 52290 «деятельность транспортная вспомогательная» |
| 98 | **Государственное учреждение «Борисовская райветстанция», тел. +37544 764-13-52** | Минская обл., г. Борисов, ул. Днепровская, 55А | 169,2 | 3,0 | 714,87 | Часть отдельно стоящего капитального строения под любые возможные цели на площадях (по согласованию с арендодателем) |
| 99 | **УП «Жильё», тел. 8 (0177) 768532** | Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. Орджоникидзе, 57 | 36,3 | 1,0 | 153,37 | Помещение под офис; для организации торговли непродовольственной группой товаров; оказание услуг (за исключением ритуальных услуг и услуг по пользованию залами игровых автоматов, компьютерных игр и физкультурно-оздоровительной деятельности); под склад. **Срок аренды – 3 года** |
| 100 | | Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. Серебренникова, 18-104 | 29,6 | 2,0 | 125,06 | Помещение под офис; для организации торговли непродовольственной группой товаров; оказание услуг (за исключением ритуальных услуг и услуг по пользованию залами игровых автоматов, компьютерных игр и физкультурно-оздоровительной деятельности); под склад. **Срок аренды – 3 года** |
| 101 | | Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. Чапаева, 45 | 19,08 | 3,0 | 80,61 | Помещение под офис; для организации торговли непродовольственной группой товаров; оказание услуг (за исключением ритуальных услуг и услуг по пользованию залами игровых автоматов, компьютерных игр и физкультурно-оздоровительной деятельности); под склад. **Срок аренды – 3 года** |
| 102 | | Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, парковка вблизи ул. Строителей, 21 | 10,7 | 58,85 БАВ | 45,26 | Асфальтированная открытая площадка для размещения передвижного состава для оказания услуг по оплате Межрайонного регистрационно-экзаменационного отделения государственной автомобильной инспекции. **Срок аренды – 3 года** |

Договор аренды заключается сроком **на пять лет**, если иное не указано в настоящей информации.

Организатор аукциона – государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 10, тел. +375 (17) 360 42 22. Аукцион состоится **21 ноября 2023 г. в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 7 (зал аукционов). Прием документов и консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 31 октября 2023 г. по 15 ноября 2023 г. включительно** в рабочие дни с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.00) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. Расчетный счет для перечисления задатка: BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, кодификатор назначения платежа – 40901, назначение платежа – **задаток для участия в аукционе № 363 от 21.11.2023 по предмету аукциона №** ___

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах изложен в извещении о проведении аукциона, размещенном на интернет-сайтах: организатора аукциона www.mgcn.by (раздел «Недвижимость в аренду»); Минского городского исполнительного комитета • www.minsk.gov.by (раздел «ПРОДАЖА/АРЕНДА»); Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь • www.gki.gov.by (раздел «ПРОДАЖА/АРЕНДА ИМУЩЕСТВА»), Минского областного исполнительного комитета – www.minskregion.gov.by (раздел «Аукционы по продаже недвижимости»). Телефон для справок +375 (17) 360 42 22

## Извещение о повторном открытом аукционе по продаже конфискованного имущества 5 декабря 2023 года

| № лота | Наименование и местонахождение недвижимого имущества | Начальная цена, руб. | Сумма задатка, руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение с инвентарным номером 400/С-66484 (наименование: административное здание, назначение: здание административно-хозяйственное). Общая площадь 727,50 кв. м. Составные части и принадлежности: пристройка. Местонахождение недвижимого имущества: г. Гродно, ул. Суворова, 127а. На основании постановления инспекции Министерства по налогам и сборам Республики Беларусь по Октябрьскому району г. Гродно наложен арест; обременение – ипотека | 527 015,77 | 52 700,00 |
| 2 | Земельный участок с кадастровым номером 422084000019000028. Общая площадь 0,0800 га. Целевое назначение – земельный участок для коллективного садоводства. Местонахождение недвижимого имущества: Гродненская область, Гродненский район, Квасовский сельсовет, СТ «Гарант», д. 348 | 2 544,00 | 254,00 |
| 3 | Капитальное строение с инвентарным номером 412/С-25038 (наименование – жилой дом). Местонахождение недвижимого имущества: Гродненская область, Мостовский район, Куриловичский с/с, д. Стукалы, ул. Кольцевая, д. 4. На основании постановления Следственного управления УСК РБ по Гродненской области наложен арест | 248,40 | 24,00 |

Лоты продаются по поручению управления по Гродненской области Департамента по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь.

Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, тел. (0152) 626055, 626056.

При проведении торгов предусмотрен шаг аукциона – 10 %. Условия продажи отсутствуют.

Уполномоченный орган и хранитель недвижимого имущества предоставляют возможность предварительно ознакомиться с недвижимым имуществом.

К участию в аукционе допускаются резиденты Республики Беларусь (при продаже земельных участков с учетом особенностей, установленных законодательством об охране и использовании земель) и нерезиденты Республики Беларусь (за исключением продажи земельных участков), которые своевременно подали заявления на участие в аукционе по форме, определенной организатором аукциона, внесли в установленном порядке задаток, представили другие необходимые документы и подписали соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (далее – участники аукциона).

К участию в торгах допускаются лица, представившие организатору торгов следующие документы:

- копии платежных поручений о внесении **задатка** за подачу заявления на расчетный счет BY24 AKBB 3012 0000 4181 0400 0000 в Гродненском областном управлении № 400 ОАО АСБ «Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 590727594, получатель – коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», с отметкой банка-отправителя об их исполнении. К заявлению на участие в аукционе прилагаются: **юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем РБ** – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; **иностранным юридическим лицом** — легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; **представителем юридического лица РБ** – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); **представителем гражданина или индивидуального предпринимателя РБ** – нотариально удостоверенная доверенность; **представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица** – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия.

Участник аукциона, желающий принять участие в аукционе по нескольким объектам (лотам), вносит задаток в сумме, предусмотренной в извещении, для каждого предмета торгов. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в день и время, установленные организатором аукциона и указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются.

Аукцион проводится в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 19.02.2016 № 63 и Положением, утвержденным организатором аукциона.

По письменному указанию подразделения Департамента недвижимое имущество может быть снято с аукциона организатором аукциона в любое время до объявления его проданным.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене продажи, увеличенной на 5 процентов.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условием на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона. Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется победителем торгов (покупателем) в течение 20 рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

Победитель обязан возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона (информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись).

**Аукцион состоится 5 декабря 2023 года в 12.00 в здании горисполкома по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, актовый зал**.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет № 117 в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 **с 3 ноября по 29 ноября 2023 года.** Телефоны для справок в Гродно: (0152) 626055, 626056. Адреса сайтов: Государственного комитета по имуществу http://gki.gov.by, Гродненского городского исполнительного комитета http://grodno.gov.by, коммунального унитарного предприятия по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости» http://gcn.by

З пошты «СГ»

# МАЯ ДРУГАЯ МАМА

## Свякроў і нявестка — хто яны ў адносінах паміж сабой? Маці і дачка ці чужыя людзі?

**ВОСЬ я адразу стала называць сваю свякроў мамай і звяртацца да яе на «вы». Мае свякроў і свёкар былі простымі вясковымі людзьмі. У самым пачатку сямейнага жыцця, падчас прыезду да іх ці ад'езду я старалася кожнага абняць і пацалаваць, але яны чамусьці ад мяне адхіляліся. У той час я не разумела, чаму яны так сябе паводзяць. Гэта ўжо потым дайшло, калі больш даведалася аб іх жыцці.**

Калі маёй свякроўцы Валянціне быў усяго годзік, не стала яе ласкавай і добрай матулі. Вясной, калі вада была яшчэ надта халоднай, яна пераходзіла праз рэчку і моцна застудзілася. Жанчына «згарэла» ў адзін момант ад высокай тэмпературы. Бацька з цягам часу прывёў другую жонку, якая аказалася злой і жорсткай мачахай. Калі дзяўчынцы споўнілася сем, мачаха аддала яе ў заробкі да чужых людзей, дзе Валя няньчыла дзяцей гаспадыні і рабіла розныя работы на агародзе і ў хаце. А ў васьмнаццаць гадоў дзяўчына страціла і роднага бацьку. Жыццё з мачахай стала нясцерпным. І калі да Валі пасватаўся хлопец з суседняй вёскі, яна не адмовіла, хоць і разумела, што выходзіць замуж за нялюбага. Мікола таксама, калі б не моцная траўма пазваночніка, якую ён атрымаў яшчэ ў дзяцінстве, магчыма, і не глянуў бы ў бок Валянціны — яна была з твару не вельмі прыгожая, ды яшчэ галеча. Вось так дзяўчына трапіла ў чужую сям'ю, дзе не прыйшлася даспадобы ні свёкру, ні свякроўцы. Але мусіла скарыцца і цярпець. А нарадзіўшы чатырох дзяцей, гадавала іх і працавала ў саўгасе на розных цяжкіх работах. Так і жыла, пазбаўленая бацькоўскай і мужняй любові, і сама не змагла выхаваць сваіх дзяцей у любові ды ў ласцы. Бо не ўмела і не ведала, як гэта рабіць.

Мой свёкар заўсёды адносіўся да мяне добра, а вось свякроў... па-рознаму. Безумоўна, яна ніколі не адпускала нас у горад з пустымі сумкамі, але давала гасцінцы як бы без душы (хоць мы кожныя выхадныя і ў водпуску ездзілі да бацькоў мужа і дапамагалі ім). А яшчэ паводзіла сябе поўнаўладнай гаспадыняй, любіла даваць каманды і хацела, каб іх абавязкова выконвалі, што мы і стараліся рабіць без спрэчак. Мая свякроў ніколі не запрашала сваіх унучак пагасцяваць у яе на канікулах. А аднойчы сказала так: «Калі зрабіць хоць адзін раз паслугу, дык будзеш усё жыццё ў даўгу».

Мая ж мама, у якой было пяцёра дзяцей і, адпаведна, багата ўнукаў, ніколі так не гаварыла. Усе ўнукі прыязджалі да маіх бацькоў на канікулы, і ўсім бацькі дарылі любоў, ласку, увагу і клопат, а дзеці адказвалі ім тым жа.

У некаторых маіх знаёмых жанчын вельмі добрыя свякроўкі, якія паводзяць сябе, як родныя матулі, і таму нявесткам з імі проста і лёгка. Ёсць каму дапамагчы дагледзець дзяцей, адвесці і забраць з садка і школы, прыгатаваць якую-небудзь страву, быць побач з дзецьмі, калі яны хварэюць... Іх нявесткам, можна сказаць, пашанцавала. Яны могуць спакойна хадзіць на працу, не перажываць і не хвалявацца.

Але ёсць і такія «сучасныя» свякрухі, якім усё роўна, як жывуць іх дзеці і ўнукі. Яны лічаць, што выканалі свой абавязак: нарадзілі і выгадавалі дзяцей, а далей няхай спраўляюцца самі. Для іх жа наступіў, урэшце, час пажыць для сябе, заняцца сваімі любімымі справамі. (Хоць я лічу, што ўсё гэта можна сумяшчаць з клопатамі аб дзецях і ўнуках.) І вось тут нявесткам не пазайздросціш. Яны пачынаюць разрывацца паміж працай і домам, што прыводзіць да ператамлення, стрэсаў і нервовых зрываў. Тут і да развалу сям'і недалёка...

Мая свякроў з гадамі, вядома, змянілася. Яна навучылася разумець, як сябе паводзіць, каб усім было добра. Калі я прыязджала да яе, мы ўсё рабілі разам. Часта за якой-небудзь працай я распытвала і з задавальненнем слухала расповеды пра далёкае мінулае. І яшчэ шмат пра што мы маглі з ёю пагаварыць. А ўнучкі сталі ўсё часцей ездзіць да яе і называць «наша бабулечка».

Але, каб такія адносіны ўзніклі паміж свекрывёй і нявесткай, трэба мець вялікае жаданне і цярпенне, як кажуць, з'есці разам не адзін пуд солі.

Усім нявесткам я жадаю, каб добрых, любячых, клапатлівых свякровак, якія ўмеюць не ствараць праблемы, а наадварот, паспяхова іх вырашаць, было як мага больш!

**Таццяна ЧЭКЕД.**

*г. Гомель.*

# ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ПАКАШТУЙЦЕ!

## СЕЛЯДЗЕЦ У ГАРЧЫЧНЫМ СОУСЕ

***Спатрэбіцца:*** *селядзец слабасалёны — 1 шт., цыбуля рэпчатая — 1 шт., жаўток вараны — 1 шт., алей — 2 ст. л., воцат 9 % — 1 ч. л., гарчыца нявострая (гатовая) — 2 ч. л., цукар — 1/4 ч. л., зялёная цыбуля і кроп — для падачы.*

Селядзец ачысціць ад унутранасцяў, зняць скуру, выдаліць хрыбет і ўсе косткі.

Нарэзаць філе невялікімі кавалачкамі.

Рэпчатую цыбулю нашаткаваць тонкай саломкай. Каб гарката сышла, заліць цыбулю кіпенем на некалькі секунд і хутка астудзіць. Кавалачкі селядца перасыпаць цыбуляй.

Прыгатаваць гарчычны соус. Вараны яечны жаўток расцерці з 2 чайнымі лыжкамі гатовай гарчыцы і 1 чайнай лыжкай сталовага воцату. Калі знікнуць камячкі, уліць 2 сталовыя лыжкі алею. Дадаць крыху цукру. Соус павінен атрымацца густы і па кансістэнцыі, як эмульсія.

Заліць рыбу гарчычнай запраўкай, змяшаць, накрыць і даць настаяцца ў халадзільніку на працягу 3-4 гадзін.

## БУЛЬБЯНАЯ САЛАТА

***Спатрэбіцца:*** *бульба — 1 кг, салёны агурок —1 шт., яйка варанае — 2 шт., зялёная цыбуля — 8 сцёблаў, пятрушка — 2 галінкі, алівкавы алей — 6 ст. л., маянэз (па жаданні) — 2 ст. л., соль і перац — на смак.*

Адварыце бульбу ў лупіне, абярыце і нарэжце кольцамі. Пакуль бульбачка яшчэ цёплая, папярчыце яе, пасаліце і паліце алівкавым алеем. Зварыце яйкі ўкрутую, парэжце іх і дадайце ў бульбу разам з надзёртым на тарцы салёным агурком і дробна нарэзанымі зялёнай цыбуляй і пятрушкай. Змяшайце салату і пры жаданні дазапраўце маянэзам.

## ЦЫБУЛЬНЫЯ КАТЛЕТЫ

***Спатрэбіцца:*** *цыбуля — 3 буйныя; часнок — 1 зубчык; яйкі — 2 шт; манныя крупы — 6 ст.л; соль, папрыка, кінза, перац, іншыя спецыі па 1 ч. л.; таматны сок — 200 мл.*

Цыбулю рэжам тонкімі кубікамі і змешваем з надзёртым часнаком. Колькасць апошняга бярыце на свой смак. Усыпаем манныя крупы і змешваем масу.

Узбіваем яйкі з соллю, перцам, спецыямі, зеляніай. Выліваем яечную масу ў цыбулю, змешваем, накрываем і пакідаем на 20 хвілін, перыядычна памешваючы.

Выкладваем у патэльню па сталовай лыжцы масы і смажым катлеткі. Далей рабіце на свой смак: можна заліць катлеты ў патэльні таматным сокам і накрыць, тушыць на невялікім агні 7 хвілін.

Калі так вам не даспадобы, тады выкладваем у патэльню кавалачак масла, здробнены часнок. Накрываем і тушым 2 хвіліны.

Падаюць цыбульныя катлеткі з бульбяным пюрэ, кавалачкамі запечанай у духоўцы бульбы, мяса, рыбы, салодкага перцу і г. д.

## ДЖЭМ З ГАРБУЗА

***Спатрэбіцца:*** *гарбуз — 1 кг; апельсін — 2 шт; цукар — 800 г; лімонная кіслата — 0,5 ч. л. ці лімон — на смак.*

Гарбуз разразаем на часткі, выдаляем насенне і здымаем скурку. Адмяраем 1 кг ачышчанага гарбуза і наразаем невялікімі кубікамі.

Цяпер бяром глыбокую патэльню і выкладваем нарэзаны гарбуз, які затым зверху засыпаем цукрам. Далей дадаём да цукру і гарбуза сок двух апельсінаў, добра ўсё змешваем. Пасля таго, як з'явіцца сок, павялічваем агонь да сярэдняга і, перыядычна памешваючы, варым, пакуль гарбуз не пачне станавіцца празрыстым і злёгку жэліраваць. Гэта зойме прыкладна 20—30 хвілін.

Калі гарбуз будзе гатовы, узбіваем яго блэндарам да аднастайнасці і дадаём лімонную кіслату або сок лімона на смак. Добра ўсё змешваем і варым яшчэ 5-10 хвілін. Калі джэм будзе дастаткова густы, раскладваем яго па падрыхтаваных слоічках, закрываем.

Акрамя таго, у гарбузовы джэм можна дадаць вострыя прыправы, напрыклад, карыцу і гваздзіку, арэхі ці садавіну, асабліва цытрусавыя. Кожны раз будзеце атрымліваць новы смак! Калі вырашыце прыгатаваць гарбузовы джэм з прыправамі, то дадаваць іх трэба не ў пачатку гатавання, а ўжо пасля ўзбівання гарбуза блэндарам, разам з лімоннай кіслатой.

ВАРТА ВЕДАЦЬ

## СВЕТ СПЕЦЫЙ

***Разбіраемся, якія спецыі да якіх страў прыдатныя***

ДЛЯ МЯСА: чырвоны, чорны, духмяны перац або гваздзіка, маяран, чабор, кмен, куркума, цыбуля, арэгана.

ДЛЯ ПТУШКІ: чабор, маяран, размарын, шалфей, базілік.

ДЛЯ РЫБЫ: лаўровы ліст, белы перац, імбір, духмяны перац, цыбуля, каляндра, перац чылі, гарчыца, кроп, чабор.

ДЛЯ ГРЫЛЯ: чырвоны перац, духмяны перац, кардамон, чабор, маяран, мускатны арэх, кмен, імбір, перац чылі.

ДЛЯ ДЗІЧЫНЫ: чабор, мацярдушка звычайная, духмяны перац, чырвоны перац, ядловец.

ДЛЯ РАГУ: чырвоны перац, імбір, куркума, каляндра, гарчыца, кардамон, кмен, чорны перац, духмяны перац, мускатны арэх, гваздзіка.

ДЛЯ КАПУСТЫ: каляндра, фенхель, кумін, насенне чорнай гарчыцы.

ДЛЯ БУЛЬБЫ: каляндра, куркума і асафетыда.

ДЛЯ БАБОВЫХ: кумін, імбір, перац, мята і каляндра.

ДЛЯ МАРЫНАДАЎ: лаўровы ліст, ядловец (ягады дадаюць у марынады для мяса дзічыны і рыбы), галінкі кропу з бутонамі, кветкамі ці насеннем.

ДЛЯ САДАВІНЫ, СОКАЎ, УЗВАРАЎ: карыца, гваздзіка, імбір, бадзьян, кардамон.

ДЛЯ ПАШТЭТАЎ: белы перац, карыца, імбір, лаўровы ліст, гваздзіка, карыца, бадзьян, імбір, кардамон.

ДЛЯ ВЫПЕЧКІ: гваздзіка, карыца, бадзьян, імбір, кардамон, духмяны перац, апельсінавая цэдра, аніс, кунжут, мак, ваніль.

ДЛЯ ГАРАЧАГА МАЛАКА: карыца, кардамон, шафран.

*ЛЕПШ У ДЗЕЎЧАК СЯДЗЕЦЬ, ЧЫМ ЗАМУЖАМ МАРНЕЦЬ (БЕЛАРУСКАЯ НАРОДНАЯ ПРЫМАЎКА).*

# Моцныя духам

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

У 2019 годзе ў аграгарадку Лясны пад Мінскам быў адкрыты Цэнтр дапамогі ахвярам ДТЗ. Яго мэта — дапамагчы пацыентам у коме ці вегетатыўным стане дасягнуць хоць бы мінімальнага прагрэсу, палепшыць якасць жыцця, а таксама навучыць блізкіх штодзённаму догляду без шкоды для ўласнага здароўя. Тут прымаюць і пацыентаў, якія атрымалі траўмы некалькі дзесяцігоддзяў таму, і тых, хто толькі пачаў аднаўляцца. А галоўнае — даюць надзею, што аднаўленне магчымае. Медыкі з'яўляюцца сведкамі рэальных гісторый, калі пацыенты і блізкія з іх дапамогай зрабілі, здавалася б, немагчымае.

## «УРАЧЫ ДАВАЛІ МНЕ СУТКІ-ДВОЕ»

Дзень, які раздзяліў жыццё 32-гадовай жыхаркі Клецка Віты на «да» і «пасля», — 13 чэрвеня 2022 года.

*— З пяцігадовай дачкой я паехала ў Капыль да сваёй маці, была за рулём. Калі вярталіся, у Сашы ўпала цацка і яна папрасіла мяне падняць. Я адшпіліла рэмень і нахілілася. Апошняе, што памятаю: калі падняла галаву, убачыла, што машына вылецела з дарогі. Я не паспела нічога зрабіць. Як мне расказалі пасля, у кювеце машына шмат разоў перавярнулася і спынілася на даху. Мяне выкінула праз лабавое шкло. Саша была ў дзіцячым крэсле, яна не пацярпела, нават змагла выбрацца з машыны, знайшла мяне ў полі. Потым спыніліся іншыя кіроўцы — два хлопцы, выклікалі «хуткую».*

*Апрытомела на другія суткі пасля аперацыі ў Слуцку, гэта была найбліжэйшая бальніца, куды былі шанцы давезці мяне жывой. У мяне былі пераломы 5-га і 6-га пазванкоў, сцісканне і ўдар спіннога мозгу, пералом лапаткі, рэбраў, адкрытая траўма грудной клеткі. Былі моцна пашкоджаны лёгкія, і медыкі найперш змагаліся не за рукі-ногі, а за лёгкія, бо я не магла самастойна дыхаць. Урачы мне давалі суткі — максімум двое — так і сказалі блізкім, што мне засталося няшмат... Я, калі апрытомела, сама зразумела, што ўсё: не варушацца ні рукі, ні ногі. Але першыя думкі былі пра дачку — я памятала, што была з ёй. Калі сказалі, што з ёй усё добра, мне таксама стала добра.*

Насуперак прагнозам Віта пражыла і суткі, і двое. Яе перавезлі ў абласную бальніцу, дзе ў нейрарэанімацыі маладая жанчына праляжала некалькі месяцаў.

*— Я не дазваляла сабе раскісаць нават у рэанімацыі, урачы называлі мяне чэмпіёнам. Не плакала, памяраць не збіралася, хацелася жыць і аднавіцца. Які сэнс плакаць? Трэба змагацца і спадзявацца на лепшае. Ніхто ў гэтай сітуацыі табе не дапаможа, калі не ты сам.*

Сёння побач з жанчынай муж, свякроў, маці, дачка, сяброўкі. Дома ёй пастаянна патрабуюцца памочнікі, нягледзячы на тое, што дзякуючы курсам рэабілітацыі і штодзённым самастойным заняткам удалося часткова аднавіць рухавасць рук і ўмацаваць мышцы. Сёння яна можа самастойна трымаць бутэльку з вадой і нават паесці — істотны прагрэс для чалавека, у якога цела было цалкам нерухомым. Найбліжэйшая мэта — навучыцца самастойна садзіцца. Для гэтага трэба максімальна ўмацаваць спіну і рукі. Цэнтр дапамогі ахвярам ДТЗ — чарговы этап рэабілітацыі, які дазволіць наблізіцца да жаданай мэты.

*— Ці ёсць шанцы аднавіць ногі? Калі ў гэта верыць, то ёсць. Мне ўвогуле шанцаў на жыццё не давалі — не тое, што змагу быць у прытомнасці, самастойна есці і кантактаваць. Калі верыш, то ўсё атрымаецца, — упэўнена Віта.*

## «Я СПРАЦАВАЎ ЯК ПАДУШКА ДЛЯ АСТАТНІХ ПАСАЖЫРАЎ»

Такая ж мэта — аднойчы ўстаць з вазка — і ў 30-гадовага Аляксандра з Барысаўскага раёна. Цалкам спакойна, як звычайны дзень, ён згадвае 24 ліпеня 2022 года.

*— Быў на рабоце ў Карэліі, горадзе Сартавала. Выхадны, ноччу вяртаўся з дыскатэкі — пешшу прайсці трэба было 20 кіламетраў. Прагаласаваў, спынілася машына. Людзей у ёй не ведаў, як і тое, што кіроўца аказаўся нападпітку. Ён не даў рады кіраванню, урэзаўся ў скалу, зляцелі ў абрыў. Усе засталіся жывыя, з нязначнымі пашкоджаннямі. Нас ззаду сядзела чацвёра, і я спрацаваў як падушка для астатніх пасажыраў.*

*Апрытомеў, калі мяне грузілі ў верталёт. З Сартавалы за 500 кіламетраў даставілі ў Петразаводск, дзе ў адной з найлепшых клінік Расіі зрабілі аперацыю.*

*Былі пашкоджаны чатыры пазванкі, на галаве наклалі 18 швоў... Раніцай пасля аперацыі апрытомеў, добра сябе адчуваў. Зайшоў доктар, кранае за нагу, а я нічога не адчуваю, ён кажа: «Дзіўна». Пасля я сам пачаў кранаць і зразумеў, што палову цела не адчуваю. Але ніякіх дрэнных думак не было ні тады, ні да гэтага дня. Я застаўся такім, якім быў да аварыі, — ніколі не маркочуся.*

З Петразаводска праз дзевяць дзён Аляксандра перавезлі на радзіму, у Барысаў. Там паўтара месяца ён правёў у аддзяленні траўматалогіі.

*— Хірург у Петразаводску даваў 80 %, што я буду хадзіць, але не раней, чым праз год, бо пашкоджаны спінны мозг. У Барысаве маці сказалі, што сын ніколі не будзе ранейшым,* — згадвае мужчына.

Сёння Аляксандра даглядае маці-пенсіянерка, якая сама некалькі гадоў таму перанесла інсульт. Жыве сям'я ў вёсцы, у прыватным доме, на пенсію маці і Аляксандра па інваліднасці. Прычым зімой пенсія мужчыны цалкам сыходзіць на аплату ацяплення — у доме ўстаноўлены электракацёл.

Вясковы дом не разлічаны на інваліда — перасоўвацца па ім на вазку мужчына не можа, шмат парогаў. Ды і з-за пролежняў перамяшчацца ў вазок пакуль непажадана.

*— Год таму я паехаў на рэабілітацыю, але праз чатыры дні мяне адправілі ў Барысаў з запаленнем лёгкіх. Пачалося заражэнне крыві, я паміраў. Па 12 гадзін мне капалі антыбіётыкі, пералівалі кроў, плазму. З'явіліся пролежні.*

Але мужчына не здаецца. Штодзень у яго абавязковыя заняткі.

*— За тры месяцы я свой стан самастойна нашмат палепшыў. Да гэтага не мог павярнуцца, адкрыць корак. Да столі ў мяне прыкручаны гумкі, перакладзіны, побач з ложкам — скамейка, на якую можна садзіцца, — своеасаблівая спартзала.*

У планах — прыбраць парогі і пабудаваць навес у двары, каб мужчына на вазку мог выязджаць на вуліцу. Яшчэ больш амбіцыйная мэта — устаць на ногі.

*— Мне 30 гадоў, я толькі збіраўся заводзіць сям'ю, мяне цанілі як спецыяліста на рабоце. Толькі пачало ўсё атрымлівацца, як здарылася аварыя... Я ні разу не заплакаў і не засумаваў, увесь час на пазітыве. Але сёння рэальнасць такая, што без маці я ніхто. Таму выбару няма: трэба ўставаць.*

## «ПАЛІЯТЫЎ — ГЭТА НЕ ПЕРАДМОРГАВАЕ АДДЗЯЛЕННЕ»

Тое, што палепшыць стан любога пацыента можна, упэўнена і **Ірына СІДАРЭНКА, урач-тэрапеўт (загадчык) аддзялення паліятыўнай медыцынскай дапамогі з цэнтрам дапамогі ахвярам ДТЗ Мінскага абласнога клінічнага шпіталя інвалідаў ВАВ, галоўны пазаштатны спецыяліст па паліятыўнай дапамозе Мінскай вобласці.** Іх аднаўленне адбываецца з яе непасрэдным удзелам. Герой адной з самых натхняльных гісторый — 19-гадовы маладзечанец Павел Варонін. У цэнтры ён пабываў ужо тройчы.

— Першы раз пацыент паступіў да нас у стане комы. Тады ён толькі скончыў лячэнне ў рэанімацыі. На сёння ён інвалід-калясачнік. Разумее звернутую да яго размову, самастойна есць, можа складваць словы, лічыць, адрознівае колеры, гуляе ў гульні на камп'ютары. Калі бачыш такі вынік сваёй працы, гэта кранае да слёз. Ніколі не ведаеш, чым скончыцца тая ці іншая гісторыя, і часам яна аказваецца зусім не сумная, — кажа Ірына Пятроўна.

Вядома, большасць гісторый тут зусім іншыя. Шмат пацыентаў паступае ў стане комы і ў вегетатыўным стане. І мэта работы цэнтра — палепшыць якасць жыцця кожнага з іх. Калі гэта кома — зрабіць так, каб чалавек быў у свядомасці.

Амаль усе пацыенты прыязджаюць з блізкімі, бо самастойна сябе не абслугоўваюць. Свякоў тут вучаць догляду: як правільна рабіць павароты ў ложку для прафілактыкі пролежняў, своечасовай змене падгузкаў, кармленню, прысаджванню ў ложку. Для блізкіх, якія забіраюць такога хворага з рэанімацыі і вымушаны клапаціцца пра яго самастойна, такія навыкі — сапраўднае выратаванне.

Пакуль у цэнтры, які з'яўляецца часткай паліятыўнага аддзялення шпіталя ветэранаў ВАВ, усяго пяць палат на шэсць ложкаў. Калі б у перспектыве ён стаў паўнавартасным цэнтрам са сваім штатам вузкіх профільных спецыялістаў, у прыватнасці ўрачом паліятыўнай дапамогі, неўролагам, лагапедам, псіхолагам, то натхняльных гісторый было б нашмат больш. Для гэтага варта мяняць і адносіны да паліятывы.

— Паліятыў — гэта не перадморгавае аддзяленне. Мы можам рэальна палепшыць якасць жыцця пацыента, не толькі ў вегетатыўным стане ці коме, але і тых, у каго ўзровень свядомасці захаваны, хто можа сядзець і перасоўвацца на вазку. Гэта такія ж паўнапраўныя члены грамадства і любімыя кімсьці людзі, — кажа Ірына Сідарэнка.

## «СІЛА ЧАЛАВЕКА ПРАВЯРАЕЦЦА Ў ЭКСТРАННЫХ СІТУАЦЫЯХ»

У героях гэтага матэрыялу ўражвае найперш іх моц. Ад іх не пачуеце песімістычных думак, жалю да сябе і дакладна не ўбачыце слёз — толькі настрой перамагчы. Пра гэта разважаем **з настаяцелем Свята-Троіцкага прыхода аграгарадка Лясны ў гонар Святой Жыццепачатнай Троіцы протаіерэем Андрэем КРУЦЯЛЁВЫМ.** Са шпіталем ветэранаў вайны ён супрацоўнічае даўно, з 1996 года, калі быў прызначаны настаяцелям. Цяпер пад духоўным наглядам знаходзяцца і пацыенты Цэнтра дапамогі ахвярам ДТЗ.

— Сіла чалавека правяраецца ў экстранных сітуацыях. Калі ў жыцці ўсё добра, ён жыве ў дастатку, на сваіх нагах і сваім розумам, нельга сказаць, ці моцны гэта чалавек. У экстранных сітуацыях — у турме, канцлагеры, падчас хваробы, вайны — праяўляецца наша сапраўднае я, — кажа айцец Андрэй. — Калі чалавек атрымаў інваліднасць і годна нясе свой крыж, па законах нашай веры яго чакае вянец у тым, вечным, жыцці, бо ён тут выпакутаваў усё, не зламаўся, не азлобіўся на людзей і жыццё. Я заўсёды звяртаю ўвагу на блізкіх — маці, жонак, мужоў. Важна, каб у іх хапіла цярпення вынесці гэты цяжкі крыж — пакуты блізкага чалавека. Заўсёды хвалю, што не адмовіліся, не кінулі — гэта сапраўды подзвіг.

Айцец Андрэй усцешаны, што ў апошнія гады пачалі звяртаць нашмат больш увагі на людзей з інваліднасцю.

— Гэта вялікая справа, што наша грамадства павярнулася да такіх пакутных людзей. Часцей за ўсё чалавек так лічыць: пакуль мяне не датычыцца, я пра гэта не думаю, закране — буду думаць. Усё ж такі мы, здаровыя, павінны клапаціцца пра гэтых людзей.

**Алена КРАВЕЦ.**

# СТВАРАЦЬ, НАТХНІЎШЫСЯ МАЛІТВАЙ ЕФРАСІННІ

**У Нацыянальным мастацкім музеі адбылося адкрыццё выстаўкі «Святасць зямлі беларускай». Па экспазіцыі можна было прасачыць вынікі аднайменнага VIII Міжнароднага мастацкага пленэру, які сёлета быў прысвечаны 850-годдзю прастаўлення прападобнай Ефрасінні Полацкай і Году міру і стваральнай працы.**

Арганізатарамі пленэру выступілі Беларускі саюз мастакоў, Беларуская праваслаўная царква, Беларускі саюз жанчын і іншыя арганізацыі. Яго ўдзельнікі наведалі Спаса-Ефрасіннеўскі жаночы мітрапалічы манастыр у Полацку, азнаёміліся з праваслаўнымі святынямі горада. Яшчэ яны завіталі ў Івянецкі дом-інтэрнат для дзяцей з асаблівасцямі развіцця, дзе гасцей чакаў канцэрт выхаванцаў і знаёмства з іх працамі. Там жа арганізавалі дабрачынны аўкцыён, сродкі ад якога накіравалі на рэалізацыю сацыяльнага праекта «Мастакі — дзецям лета».

А сярод прадстаўленых на выставе прац мастакоў з Беларусі, Расіі і Малдовы можна ўбачыць шмат вобразаў нябеснай заступніцы зямлі беларускай, якая ўвасабляе сабой прыклад міралюбнасці, любові да бліжніх, пакорлівасці. Падзвіжніцкая праца святой Ефрасінні, заснаванне ёю храмаў і манастыроў, што сталі цэнтрамі асветніцтва ў Полацкім княстве, пераклад і стварэнне рукапісных копій богаслужэбных кніг — знакавыя і вызначальныя падзеі ў гісторыі культуры нашай краіны. Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Веніямін, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі адзначыў, што менавіта гэта і выклікае цікавасць сучасных людзей да яе асобы.

Фота Віктара ІВАНЬКАВА.

— Святасць зямлі беларускай найперш праяўляецца ў людзях. І прападобная Ефрасіння — адзін з найбольш яркіх вобразаў праявы святасці, якая ўвасабляецца і ў храмах, малітвах, прыродзе — тэмах карцін, што прадстаўлены на выстаўцы, — заўважыў мітрапаліт.

На выставе, дзе каля паўсотні мастацкіх твораў (нацюрморты, пейзажы, сімвалічныя і сюжэтныя кампазіцыі) можна ўбачыць працы як вядомых майстроў (Глеба Отчыка, Анатоля Отчыка, Аксаны Еўдакіменка, Юрыя Язана, Галіны Конанавай), так і маладых мастакоў (Ганны Садоўскай, Марты Шчэрбіч). Акрамя гэтага, значным акцэнтам выстаўкі сталі 30 прац пераможцаў рэспубліканскага конкурсу дзіцячага малюнка, які прайшоў падчас пленэра. І апынуўшыся побач з гэтымі экспанатамі, кожны мае магчымасць запаволіцца ў жыццёвай мітусні, зазірнуць унутр сябе, супакоіцца і паразважаць, падумаць пра вечнае. Таксама падчас адкрыцця прысутныя маглі пазнаёміцца з факсімільнымі і сучаснымі, духоўнымі і свецкімі выданнямі — Полацкім Евангеллем, жыціем Ефрасінні Полацкай, Новым Запаветам у перакладзе на беларускую мову.

У сваю чаргу старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіццю Ірына Старавойтава агучыла свае эмоцыі ад убачанага:

— Калі бачыш вобразы, якія тут прадэманстравалі, то разумееш, наколькі важна сёння працаваць з моладзю і фарміраваць у іх гэтую духоўнасць, душэўнасць і мараль. Бо менавіта гэта тыя каштоўнасці, якія ляжаць у аснове міру і стваральнай працы.

Наведаць выстаўку «Святасць зямлі беларускай» можна ў Нацыянальным мастацкім музеі да 3 снежня бягучага года. Пасля экспазіцыя адправіцца ў вандроўку па гарадах Беларусі.

**Алена ДРАПКО.**

# Извещение о проведении 22 ноября 2023 года повторных аукционных торгов по продаже имущества, принадлежащего УП «УКС Мингорисполкома»

Сведения о продаваемом имуществе (предмете торгов)

| № предмета торгов | Наименование и характеристики продаваемого имущества | Начальная цена, бел. руб., с учетом НДС | Размер задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | Стеклопакет размером 1377*2777 в количестве 10 штук | 1 884,10 | 188,00 |
| 2 | Стеклопакет размером 1377*677 (непрозрачные) в количестве 10 штук | 459,26 | 45,00 |
| 3 | Стеклопакет размером 1377*677 (непрозрачные) в количестве 10 штук | 459,26 | 45,00 |
| 4 | Стеклопакет размером 1377*677 (непрозрачные) в количестве 10 штук | 459,26 | 45,00 |
| 5 | Стеклопакет размером 1377*677 (непрозрачные) в количестве 10 штук | 459,26 | 45,00 |
| 6 | Стеклопакет размером 1377*677 (непрозрачные) в количестве 10 штук | 459,26 | 45,00 |
| 7 | Стеклопакет размером 1377*677 (непрозрачные) в количестве 10 штук | 459,26 | 45,00 |
| 8 | Стеклопакет размером 1377*677 (непрозрачные) в количестве 10 штук | 459,26 | 45,00 |
| 9 | Стеклопакет размером 1377*677 (непрозрачные) в количестве 10 штук | 459,26 | 45,00 |
| 10 | Стеклопакет размером 1377*677 (непрозрачные) в количестве 10 штук | 459,26 | 45,00 |
| 11 | Стеклопакет размером 1377*677 (непрозрачные) в количестве 10 штук | 459,26 | 45,00 |
| 12 | Стеклопакет размером 1377*677 (непрозрачные) в количестве 10 штук | 459,26 | 45,00 |
